Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа № 1 г. Старыя Дарогі імя
Героя Савецкага Саюза Ф.Ф.Кулікава”

# ВЫКАРЫСТАННЕ АКТЫЎНЫХ ПРЫЁМАЎ НАВУЧАННЯ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ ЯК СРОДАК АКТЫВІЗАЦЫІ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ



Старыя Дарогі 2023

З вопыту работы настаўніка беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Кулявец Ліліі Іванаўны

Выкарыстанне актыўных прыёмаў навучання на ўроках беларускай мовы і літаратуры як сродак актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў/ пад рэд. Л.І.Кулявец; ДУА "Сярэдняя школа №1 г. Старыя Дарогі імя Героя Савецкага Саюза Ф.Ф.Кулікава". – Старыя Дарогі, 2020. – 63с.

---

Выданне ўтрымлівае матэрыялы з вопыту работы настаўніка беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Кулявец Ліліі Іванаўны.

Прапанаваныя матэрыялы маюць практычную значнасць і могуць быць выкарыстаны настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў адукацыйным працэсе.

Матэрыялы друкуюцца ў аўтарскай рэдакцыі.

# ЗМЕСТ


Метадычная скарбонка “Актыўныя прыёмы на ўроках беларускай мовы і літаратуры” ............................4

Майстар-клас “Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці на ўроках беларускай літаратуры: прыёмы і метады” ............................11

Майстар-клас “Рэфлексія як сродак самаацэнкі асабістай дзейнасці вучняў” ............................16

Урок-квэст як форма навучання і выхавання пры выкладанні вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура” “Лірычная гасцёўня” ............................22

Майстар-клас “Сучасны метадычны інструментарый у рабоце настаўніка з адоранымі вучнямі” ............................27

Урок беларускай літаратуры ў 6 класе. Літаратурная песня. Алесь Ставер “Жураўлі на Палессе ляцяць…” ............................33

Урок беларускай мовы ў 9 класе. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах ............................37

Урок беларускай літаратуры ў 5 класе. Максім Танк “Ля вогнішч начлежных” ............................42

Урок беларускай літаратуры ў 8 класе. Якуб Колас “Хмарка” ............................46

Майстар - клас "Выкарыстанне тэхналогіі візуалізацыі ў адукацыйным працэсе” ……………….49

Фотасправаздача ............................58

*Чалавек, які жадае перацягнуць гору, пачынае з таго,*
*што пераносіць дробныя камяні.*
*Кітайская мудрасць*

## Метадычная скарбонка “Актыўныя прыёмы на ўроках беларускай мовы і літаратуры”

Навучанне на ўроках беларускай мовы і літаратуры эфектыўна толькі тады, калі вучні самі жадаюць атрымліваць веды, а для гэтага неабходна ўключыць іх у актыўны працэс пазнання. І для мяне такім сродкам актывізацыі пазнавальнай дзейнасці стала выкарыстанне актыўных прыёмаў навучання, якія, у сваю чаргу, спрыяюць павышэнню матывацыі да вывучэння прадмета, а ў выніку – павышаюць і якасць ведаў. Таму я на ўроках пачала прымяняць і спалучаць разнастайныя прыёмы для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці.

За час працы я прыйшла да высновы, што актыўныя прыёмы не толькі развіваюць творчыя здольнасці вучняў, але і фарміруюць іх пазнавальную актыўнасць. Я хачу зацікавіць вучняў сваім прадметам, абудзіць іх думкі, нават нечым здзівіць, выклікаць жаданне глыбей зразумець тую ці іншую з’яву. І, урэшце, абудзіць унутраную матывацыю дзяцей, дзе прыярытэтным стане пазнавальная дзейнасць, матыў поспеху і супрацоўніцтва, павышэнне якасці ведаў, а не толькі жаданне атрымаць станоўчую адзнаку.

Я хачу на сваіх ўроках бачыць зацікаўленых вучняў, у якіх ёсць жаданне вучыцца, таму для мне вельмі важна імкнуцца прымяняць і спалучаць разнастайныя прыёмы для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці. У сваёй педагагічнай дзейнасці я выкарыстоўваю актыўныя прыёмы на ўсіх этапах урока.

| Этап урока, мэта прыёма | Прыём | Методыка правядзення |
|---|---|---|
| **Арганізацыйна-матывацыйны этап**<br><br>**Мэта:** спрыяць узнікненню ў вучняў станоўчых эмацыянальных адносін да пазнавальнай дзейнасці, стварэнне | Памяняемся месцамі<br><br>Які я?<br><br>Камплімент<br><br>Алітэрацыя | Настаўнік задае розныя пытанні. Пры супадзенні адказаў вучні мяняюцца месцамі.<br><br>Даюць адказы на пытанні: які я для сябе, для сяброў, для сям'і і г.д.<br><br>Па чарзе гавораць адзін аднаму кампліменты.<br><br>Назваць свайго суседа і даць характарыстыку на першую літару яго імя. |

| | | |
|---|---|---|
| добрага эмацыянальнага настрою. | Інтэрв’ю<br><br>Прагноз надвор’я<br><br>Аратар | Задаць некалькі пытанняў у аднакласнікаў пра настрой, пра адчуванне на ўроку.<br><br>Расказаць пра душэўныя адчуванні “мовай” надвор’я: пара года, пахмурна ці ясна, ці ёсць ападкі.<br><br>Вучні пераконваюць у неабходнасці вывучэння тэмы. |
| **Актуалізацыя ведаў вучняў**<br><br>**Мэта:**<br>узнавіць і зафіксаваць веды, уменні і навыкі дзеля наступнай пазнавальнай дзейнасці. | Спытай у суседа<br><br>Правільныя і няправільныя сцвярджэнні<br><br>Рассыпаныя паштоўкі<br><br>Веру – не веру<br><br>Анкета героя<br><br>Сляпы тэкст<br>Белыя плямы<br><br>Пазл<br><br>Слова ў мяшку<br><br>Снежны ком | Вучні ў парах расказваюць адзін аднаму правіла, або адзін задае пытанне, а другі адказвае.<br><br>Настаўнік зачытвае пытанні па тэме, а вучні ў сшытку ці на асобных лісточках фіксуюць адказы пры дапамозе значкоў +, –.<br><br>У паштоўках знаходзяць ключавыя фразы, адказы на пытанні. Трэба правільна скласць адказ на пытанне настаўніка.<br><br>Настаўнік задае пытанні па тэме, а вучні даюць адказ: веру або не веру.<br><br>Скласці анкету героя па набытых на папярэдніх уроках ведах.<br><br>У прапанавым тэксце ўставіць неабходныя факты, звесткі, паняцці.<br><br>Пры дапамозе пазлаў узнавіць веды па тэме.<br><br>З мяшэчка даставаць словы і расказаць, з чым, з якім фактам гэта слова звязана.<br><br>Адзін вучань называе адно паняцце, другі яго паўтарае і называе сваё паняцце, трэці паўтарае паняцці першага і другога, а таксама |

| | | |
|---|---|---|
| | | называе нешта сваё  і г.д. |
| **Мэтавызначэнне**<br><br>**Мэта:** забяспечыць разуменне вучнямі іх дзейнасці. | Эпіграф<br>Мой выбар<br><br>Праблемнае пытанне<br><br>Мазгавы штурм<br><br>Ведаю – Хачу ведаць – Даведаўся<br><br>Дрэва прадказанняў<br><br>Інфа-карусель<br>Чаканне<br><br>Індуктар | Прапанаваць шэраг новых слоў або выказванняў, якія павінны выклікаць асацыяцыі.<br><br>Настаўнік задае праблемнае пытанне, вучні прапануюць свае адказы.<br><br>Вучні выказваць свае асацыяцыі і здагадкі па тэме.<br><br>Запаўняюць таблічку ці вусна агучваць адказы на пытанні.<br><br>Выказваюць свае прадказанні наконт тэмы і дзейнасці на ўроку.<br><br>Па чарзе на лісточку запісваюць свае чаканні наконт дзейнасці на ўроку.<br><br>Перад праглядам рэпрадукцый карцін, малюнкаў, урыўкаў з кінастужак, мультфільмаў настаўнік ставіць перад вучнямі задачу падумаць, як гэта будзе звязана з тэмай урока. |
| **Вывучэнне новага матэрыялу**<br><br>**Мэта:** актывізацыя пазнавальнай дзейнасці праз арганізацыю ўзаемадзеяння. | Кластар<br><br>“Тонкія” і “тоўстыя” пытанні<br><br>Пчаліны вулей<br><br>Жакей і конь<br><br>Зігзаг | У так званыя “планеты” заносяцца ключавыя паняцці па новай тэме, фіксуюцца новыя веды і знаходкі.<br><br>Пры дапамозе кароткіх і разгорутых пытанняў вучні асэнсоўваюць новыя веды па тэме.<br><br>У групах вучні самастойна знаходзяць патрэбныя веды і новыя факты па тэме.<br><br>Першая група атрымлівае карткі з пытаннямі, другая – з правільнымі адказамі. Кожны “жакей” павінен знайсці свайго “каня”.<br><br>Матэрыял, які неабходна засвоіць, |

| | | |
|---|---|---|
| | | папярэдне дзеліцца на часткі і кожнай групе прапануецца пэўная частка, пасля вывучэння якой вучні разыходзяцца па іншых групах, дзе адбываецца ўзаеманавучанне. |
| | Ідэал | Прапануюць пяць крокаў да вырашэння праблемы, знаходжання ІДЭАЛьнага вырашэння пытання па тэме. |
| | Рознакаляровыя пытанні | Вучні фармулююць пытанні, на якія б хацелі атрымаць адказ. Настаўнік складае рэйтынг найбольш значных пытанняў і размяркоўвае іх па групах. Групы адказваюць на пытанні і прэзентуюць вынік сваёй працы. |
| **Замацаванне матэрыялу**<br><br>**Мэта:** актывізаваць разумовую дзейнасць вучняў. | Чатыры куты | Настаўнік на чатыры парты кладзе лісты рознакаляровай паперы і прапануе адказаць на пытанні па тэме. Вучні падыходзяць да таго колеру, які адпавядае зробленаму вываду, і аргументуюць свой адказ. |
| | Фішбоўн (рыбная костка) | Пры дапамозе ключавых пытанняў вучні прыводзяць асабістыя факты, аргументы і доказы па тэме. |
| | Колы Вена | Вучні размяшчаюць набытыя веды ў колы. Чым бліжэй да цэнтра вучні размяшчаюць новыя паняцці, тэрміны, тым лепш яны іх засвоілі, чым далей – над гэтым матэрыялм трэба яшчэ папрацаваць. |
| | Бумеранг | Група на лісце піша асноўныя палажэнні па тэме, затым перадае іншай групе, якая дапаўняе, удакладняе адказ. У выніку група павінна атрымаць назад свой адказ у дапоўненым выглядзе. |
| | ПАПС – формула | Пры дапамозе ключавых пытанняў (П – пазіцыя: мы лічым, што... А – |

| | | |
|---|---|---|
| | (хвілінка гаварэння) | абгрунтаванне: ...таму, што... П – прыклад: вось прыклад... С – меркаванне: значыць...) вучні прапаноўваюць свае вывады па тэме. Зачытваецца сцвярджэнне, а вучні падымаюць картку “Так”/ “Не” і тлумачуць сваю пазіцыю. |
| | Займі пазіцыю | З прапанавых прыкмет вызначыць, чыё гэта і размясціць пад адпаведнай таблічкай. |
| | Чыё гэта? | Группы атрымліваюць карткі з паняццем або з’явай, з якіх збіраюць паслядоўны ланцужок, а потым тлумачаць логіку яго пабудовы. |
| | Лагічны ланцужок Толькі факты | Вучні сцісла запісваюць інфармацыю пра тое, аб чым даведаліся на ўроку, потым распавядаюць суседу і запісваюць у картку пра тое, каму распавядалі і што новага даведаліся. |
| | Што, калі... | Прыдумаць пытанні да тэмы, якія пачынаюцца словамі: Што, калі... |
| **Рэфлексія**<br><br>**Мэта:** дапамагчы вучням прааналізаваць сваю работу на ўроку, а таксама ўнутраны стан, думкі, эмоцыі. | Святлафор<br><br>Кубік Блума<br><br>Мне гэта спатрэбіцца...<br><br>Спіс пытанняў Адны пытанні | Пры дапамозе адпаведных колераў святлафора выказаць свае меркаванні наконт працы на ўроку.<br><br>На гранях кубіка змешчаны пытанні: “Назаві”, “Растлумач”, “Чаму?”, “Прапануй”, “Прыдумай”, “Падзяліся”. Вучні па чарзе кідаюць кубік і фармулююць пытанне па тэме.<br><br>Выказаць свае адносіны да тэмы і ключавыя факты, якія вынеслі з урока.<br><br>Скласці спіс пытанняў, да якіх мэтазгодна вярнуцца на наступным уроку, ці спіс пытанняў, які можна задаць суседу. |

| | | |
|---|---|---|
| | Алфавіт<br>Алітэрацыя<br>Акраслова | Падабраць адпаведныя словы да літар ключавога слова па тэме ўрока. |
| | Ланцужок пажаданняў | Па чарзе выказаць свае пажаданні да аднакласнікаў па выніках іх працы на ўроку. |
| | Пытанне ў капелюшы<br>Сарбонка пытанняў | Даставаць пытанні па тэме з капелюша ці скарбонкі і паспрабаваць даць кароткія адказы. |
| | Тры М | Назваць тры ключавыя моманты, якія запомніліся на ўроку. |
| | Шэсць шляп мыслення | Пры дапамозе так званых шасці шляп мыслення вучні могуць грунтоўна прааналізаваць сваю работу на ўроку. |
| | Плюс – Мінус – Цікава | Выказваюць свае меркаванні наконт сваёй працы на ўроку. |
| | Кросэнс | Раздаюцца паштоўкі з разнастайнымі выявамі. Вучні выбіраюць патрэбныя ім малюнкі і размяшчаюць іх у пэўным парадку, каб атрымаўся лагічны ланцужок. Кожная група прэзентуе і тлумачыць свой “Кросэнс”. |
| | Нясконченыя сказы<br>Скончы сказ | Прапаноўваецца пачатак выказвання, які трэба працягнуць, каб скончыць сказ. |
| | Сінквейн | Вучні складаюць пяцірадкоўі на прапанаваныя ключавыя словы па тэме ўрока. |
| | Адным словам<br>Ключавое слова | Пры дапамозе аднаго слова выказваюць свае адносіны да працы або акрэсліваюць эмацыянальны стан на ўроку. |

| | | |
|---|---|---|
| | Рэцэпты поспеху | Вучні аб’ядноўваюцца ў групы і запісваюць тое, што выклікала цяжкасць у працэсе ўрока. Потым групы абменьваюцца лістамі, знаёмяцца са зместам праблем і прапаноўваюць накірункі магрымых вырашэнняў у выглядзе рэкамендацый. |
| | Адны пытанні | Запісаць адно пытанне па тэме. Лісткі здаюцца настаўніку, потым кожны вучань па чарзе выцягвае лісток і адказвае на пытанне, якое яму трапіла. |
| | Граблі, цвік | Выбраць адпаведную прыладу з мэтай адлюстраваць вынік асабістай працы на ўроку. |
| | Лесвіца поспеху | Прааналізаваўшы сваю работу на ўроку, “паставіць” сябе на пэўную прыступку лесвіцы. |
| | “Дрэва” | Пры дапамозе рознакаляровых “лісточкаў” дрэва адлюстраваць актыўнасць і вынік сваёй працы на ўроку. |

Я пераканалася ў тым, што для выкарыстання актыўных прыёмаў на ўроках патрэбна вялікая дадатковая падрыхтоўка. Але гэта неабходна дзеля таго, каб дзеці адчувалі сябе ўтульна, працавалі творча і плённа. Неабходна гаварыць аб супрацоўніцтве, дыялогу паміж настаўнікам і вучнямі. І выкарыстанне разнастайных прыёмаў дазваляе мне быць пастаянна ў творчым пошуку, самаразвівацца, павышаць рост прафесійнага майстэрства.

## Майстар-клас
## “Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці на ўроках беларускай літаратуры: прыёмы і метады”

**Мэта:** арганізацыя педагагічнага ўзаемадзеяння для прэзентацыі прыёмаў і формаў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці.

**Задачы:** стварыць умовы для фарміравання матывацыйнай гатоўнасці ўдзельнікаў майстар-класа да азнаямлення з прыёмамі і формамі актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў;
предэманстраваць магчымасці выкарыстаных прыёмаў, формаў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці на ўроках і прагназуемыя вынікі іх прымянення.

**Эпіграф:**

Я гараджанін часовы,
Праз бетон, праз цагліны
Чую траў перазовы,
Сум засохлай галіны.
Р. Барадулін

### Ход майстар-класа

**1. Арганізацыйны момант**

Добры дзень! Я рада вас вітаць на сённяшніх занятках! Сёння мы з вамі сабраліся, каб паспрабаваць знайсці адказ на адно пытанне: як закрануць, зварушыць вучня. Вы згодны са мною? Сёння мы многа гаворым пра сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, аднак, усё роўна мы больш выкарыстоўваем традыцыйныя метады. Нам не хапае часу. Аднак успомнім, калі на ўроку мы прымяняем нешта новае, цікавае, як ў дзяцей зіхацяць вочы. Для таго, каб закрануць вучня, у сваёй рабоце мы павінны імкнуцца выкарыстоўваць новыя, цікавыя, эфектыўныя прыёмы. Усё гэта дзеля таго, каб пасля ўрока адчуць асалоду і дзіцячую падзяку.

За час працы ў мяне сабралася свая метадычная капілка для арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў. І пагэтаму тэма нашых заняткаў “Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці на ўроках беларускай літаратуры: прыёмы і метады”.

І няхай нашым дэвізам на сёння будуць словы: “Падкінутаму каменню не пагражае плесня!”

***Прыём “Давайце пазнаёмімся”***

Мы з вамі жывём у адным горадзе, раёне, але не вельмі часта сустракаемся. Многія ведаюць адзін аднаго, але давайце з вамі яшчэ раз пазнаёмімся. На картках напішыце свае імёны так, каб вы хацелі, каб да вас звярталіся.

***Прыём “Які Я”***

А зараз запоўніце свае таблічкі “Які  Я”.
Мэта: разабрацца ў сябе, расказаць іншым пра сябе.

| | |
|---|---|
| **Я для сябе** | **Я для сям’і** |
| **Я для сяброў** | **Я для калег** |

2. **Матывацыя**

**2.1. Пастаноўка праблемы**

Прагляд відэа.

***Прыём “Інфа-карусель”***

Па чарзе кожны запісвае свае  адказы на праблемнае  пытанне:
- Якая тэма нашых сённяшніх заняткаў?

Перадаюць другой групе свае запісы і разам высвятляюць тэму заняткаў.

**2.2. Мэтавызначэнне**

***Прыём “Чаканне”***

За 1 хвіліну напісаць на каляровых сцікерах:
(зялёны) ведаю па гэтай тэме;
(жоўты) хачу навучыцца;
(чырвоны) хачу даведацца.
Групы агучваюць свае чаканні. Пастаноўка мэты майстар-класа.
- Прыемна, што сёння сабраліся зацікаўленыя людзі, якія жадаюць даведацца, навучыцца…

3. **Арганізацыйна – дзейнасны этап**

***Прыём “Мазгавы штурм”***

Удзельнікі называюць усё, што ведаюць па гэтай тэме.
- імя аўтара;
- назва твора;
- род  літаратуры;
- тэма;
- асноўная думка і г.д.

***Прыём “Жакей і конь”***

Першая група атрымлівае карткі з пытаннямі, другая – з правільнымі адказамі. Кожны “жакей” павінен знайсці свайго “каня”.

| **“Жакей”** | **“Конь”** |
|---|---|
| Імя аўтара твора? | Рыгор Іванавіч Барадулін |
| Званне аўтара | Народны паэт Беларусі (1992 год) |
| Месца нараджэння | Ушацкі раён, Віцебская вобласць |
| Паэт працаваў … | У рэдакцыі  выдавецтва  “Беларусь” і “Мастацкая літаратура”, у газеце “Савецкая Беларусія”, у часопісах |

| | “Бярозка” і “Полымя” |
|---|---|
| Творчы здабытак | 70 зборнікаў паэзіі |
| Чым адметны зборнік паэзіі “Ксты”? | У 2006 годзе стаў намінантам на Нобелеўскую прэмію ў галіне літаратуры са зборнікам “Ксты” |
| Як называецца паэма, якую прысвяціў Р.Барадуліну Уладзімір Караткевіч? | Паэма “Ладдзя роспачы” |
| Якую краіну наведаў Р.Барадулін і ў каго з вядомых дзеячаў быў на асабістай аўдыенцыі? | Р. Барадулін у 2004 годзе наведаў Італію. У Ватыкане меў асабістую аўдыенцыю з Папам Рымскім Янам Паўлам II. |

***Стратэгія “Ідэал”***

Мы шукаем “ІДЭАЛьны” метад рашэння праблемы. Кожная літара – гэта крок, які трэба зрабіць, каб павысіць верагоднасць выхаду з цяжкага становішча.




1 група. Хто з’яўляецца лірычным героем верша? Якія яго жыццёвыяпрынцыпы?
2 група. Якая праблема ўздымаецца ў вершы?
*Прэзентацыя груп.*

**Фізкультхвілінка**

***Метад "Друдлы"***

Друдлы – гэта цікавае вынаходніцтва амерыканскага юмарыста і прадзюсара, якое яны прапанавалі ў 1950-х гадах. Назва паходзіць, як камбінацыя трох слоў: каракулі, малюнак, загадка.

Так, друдлы – гэта загадкі. Друдл адзін, а версій мноства. Мэта: развіццё творчага мыслення.

Кожнай групе даецца свой друдл, усе ўдзельнікі па чарзе запісваюць свае асацыяцыі, а потым агучваюць другой камандзе. Другая каманда можа выказаць свае прапановы наконт убачанага, якія яшчэ не прагучалі.

***Прыём "Творчая лабараторыя"***

Напісанне верша сінту.

Верш з пяці радкоў – гэта сінту. Ён уяўляе сабой асаблівы від верша, што ўзнік у Японіі. Складанне сінту з'яўляецца спосабам апісання чаго-небудзь, і спосабам выражэння сваіх адносін да таго, што апісваецца.

Існуюць пэўныя **правілы напісання сінту**:

**1 радок** – слова, якое абазначае тое, што апісваецца (неба, радасць, роздум, паэзія, родны дом, краіна і інш.).

**2 радок** – назіранне за тым, што апісваецца праз адчуванне якой-небудзь мадальнасці (зрок, слых, смак, уяўленне і інш.).

**3 радок** – думка, пачуццё або меркаванне пра тое, што апісваецца.

**4 радок** – яшчэ адно назіранне, якое выражана пры дапамозе іншай мадальнасці, якая адрозніваецца ад выкарыстанай у другім радку.

**5 радок** – сэнсавая прыкмета аб'екта апісання, якая выражана адным словам.

Вясна.
Усё абуджае ад сну.
Паданне кропель…
Пах зялёнай травы.
Хутка лета.

Ноч.
Нічога не чуваць.
Спакой.
Бачны загадкавы свет.
Невядомасць.

На працу – 3 хвіліны.

*Чытанне складзеных вершаў, абмеркаванне.*

**4. Рэфлексія**

***Прыём "Плюс – Мінус – Цікава":***

- усё, што спадабалася;
- ведаў;

- вазьму для сябе; што я з гэтым буду рабіць.

***Прыём "Дзякуй"***

Кожны можа выказаць падзяку любому ўдзельніку, які дапамагаў яму на працягу заняткаў.

***Прыём "Граблі – цвік"***

Граблі – што ўзяў для сябе; цвік – яшчэ раз усвядоміў, запомніў, замацаваў.

Паважаныя калегі, я прапанавалала вам некалькі прыёмаў і метадаў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці на ўроках беларускай літаратуры. Як вы лічыце, ці можна прымяняць такія метады на другіх уроках? А можаце вы прапанаваць нешта сваё? Ці ёсць у вас свае цікавыя знаходкі? Агучце.

Дарагія сябры, я не ведаю, можа, сёння на маім майстар-класе каму-небудзь было вельмі лёгка, камусьці крышачку складана. А мне ж было вельмі цікава. І вялікі вам дзякуй за гэта!

А закончыць нашу з вамі сустрэчу я хачу сваім сінту.

Жыццё.
Пастаянная мітусня.
Не паспееш азірнуцца – яно прайшло.
Кожны тут іграе сваю ролю.
Тэатр працягласцю ў стагоддзі!



## Майстар-клас
## “Рэфлексія як сродак самаацэнкі асабістай дзейнасці вучняў”

**Мэта:** арганізацыя педагагічнага ўзаемадзеяння для прэзентацыі прыёмаў і формаў рэфлексіі.

**Задачы:** стварыць умовы для фарміравання матывацыйнай гатоўнасці ўдзельнікаў майстар-класа да азнаямлення з прыёмамі рэфлексіі;
даць уяўленне пра класіфікацыю відаў рэфлексіі;
прадэманстраваць магчымасці выкарыстаных прыёмаў рэфлексіі на ўроках і прагназуемыя вынікі іх прымянення.

### Ход майстар-класа

**1. Арганізацыйны момант**

Добры дзень! Я рада вас вітаць на сённяшніх занятках! Хачу пажадаць Вам творчых поспехаў, натхнення, жадання несці веды дзецям і самім спасцігаць новае.

Тэма нашых заняткаў: “Рэфлексія як сродак самаацэнкі асабістай дзейнасці вучняў”.

Метадычны ***прыём “Індуктар”*** – праблемная сітуацыя – пачатак, матывуе творчую дзейнасць кожнага. (Мэта: дапамагчысуаднесцістарыя веды з новымі.)

– Паважаныя калегі, а што такое “рэфлексія”? Што мы ведаем пра гэта паняцце?

**Рэфлексія зместу майстар-класа**

*Запаўненне табліцы-фіксацыі.*

| Паняцце | Ведаю | Хачу даведацца | Даведаўся |
|---|---|---|---|
| Рэфлексія | | | |

**2. Тэарытычнае абгрунтаванне праблемы**

На пачатку заняткаў нам неабходна зразумець тэарытычнае абгрунтаванне паняцця “рэфлексія” як сродка самаацэнкі асабістай дзейнасці вучняў.

Сёння, каб быць паспяховым, вучань, акрамя пэўных ведаў, уменняў і навыкаў, павінен авалодаць уменнем самастойна аналізаваць, кантраляваць, ацэньваць сваю дзейнасць. І гэтаму, у першую чаргу, дапамагае рэфлексія.

Слова ***рэфлексія*** паходзіць ад лац. словы – зварот назад.

Слоўнік замежных слоў вызначае ***рэфлексію як самапазнанне***.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы – як ***самааналіз***.

У сучаснай педагогіцы пад рэфлексіяй разумеюць самааналіз дзейнасці і яе вынікаў. ( М.І.Запрудскі)

Рэфлексія можа ажыццяўляцца не толькі ў канцы ўрока, як гэта прынята лічыць, але і на любым яго этапе. Асноўнай мэтай рэфлексійнай дзейнасці на ўроку з'яўляецца ўсведамленне вучнямі метаду пераадолення цяжкасцяў і самаацэнка імі вынікаў сваёй карэкцыйнай дзейнасці.

Стадыя рэфлексіі неабходная не толькі для таго, каб настаўнік праверыў памяць сваіх вучняў, але і для таго, каб яны самі змаглі прааналізаваць, ці ўдалося ім дасягнуць пастаўленых мэтаў.

Пры выбары рэфлексіі неабходна ўлічваць мэту ўрока, змест вучэбнага матэрыялу, спосабы і метады навучання, узроставыя і псіхалагічныя асаблівасці вучняў.

**Формы выражэння рэфлексіі:**

Вербальныя формы:

- вуснае абмеркаванне;
- апавяданне;
- выказванне змяненняў, якія адбыліся;
- апытванне.

Невербальныя формы:

- сачыненне;
- пісьмовае анкетаванне;
- графічнае або малюнкавыя выявы змяненняў, якія адбыліся.

**Класіфікацыя рэфлексіі:**

1) па змесце:

- вусная;
- пісьмовая.

2) па форме дзейнасці:

- індывідуальная;
- групавая;
- калектыўная.

3) па спосабу правядзення:

- анкетаванне;
- апытванне;
- малюнак і г.д.

4) па функцыях:

- фізічная (паспеў-не паспеў, лёгка-цяжка);
- сэнсарная (цікава-сумна, дыскамфортна - камфортна);
- інтэлектуальная (што зразумеў-не зразумеў, якія цяжкасці адчуваў).

**Па колькасці аб'ектаў рэфлексіі вылучаюцца:**

- з цвёрда зададзенай колькасцю аб'ектаў («Пяць пальцаў», «Мішэнь»);
- шматмерныя або варыятыўныя, якія дазваляюць гнутка вар'іраваць колькасць аб'ектаў рэфлексіі ( «Рамонак»).

**Зыходзячы з іх функцый, адрозніваюць тры віды рэфлексіі:**

1. Рэфлексія эмацыянальнага стану і настрою.
2. Рэфлексія дзейнасці на ўроку.
3. Рэфлексія зместу вучэбнага матэрыялу.

**Рэфлексія настрою і эмацыянальнага стану** праводзіцца ў пачатку і ў канцы ўрока для ўсталявання эмацыянальнага кантакту.
*“Смайлікі”*
Выкарыстанне розных малюнкаў.
*“Сонейка і хмарка”*
Эмацыйна-мастацкае афармленне, адзнака свайго эмацыйнага стану.
*“Святлафор”*
*“Краявід”*
*“Астравы”*
*“Адным словам”*
*“Ланцужок пажаданняў”*

**Рэфлексія дзейнасці вучняў** дазваляе асэнсаваць спосабы і прыёмы сваёй працы з навучальным матэрыялам (пры праверцы дамашняга задання, абароне праектаў, у канцы ўрока).
*“Ліст самакантролю”*
*“Дрэва поспеху”*
*“Лесвіца поспеху”*
*“Аргументацыя свайго адказу”*
*“Выбар”*
*“Ацані сябе на ўроку”*
*“Метад пяці пальцаў”*
*“Фразеалагізмы” або “Прыказка”*
*“Фраза для суседа па парце”*
*“SMS”*
*“Басейн”*
*“Дзякуй ...”*
*“Плюс – мінус – цікава”*
*“Слон”*
*“Пантаміма”*
*“Мішэнь”*

**Рэфлексія зместу вучэбнага матэрыялу** – гэта выяўленне ўзроўню ўсведамлення зместу вывучанага матэрыялу.
*“Няскончаны сказ”*
*“Сінквейн”*
*“Шэсць капелюшоў мыслення”*
*“Сцвярджэнне”*
*“Разбярыце слова па літарах” (алітэрацыя, алфавіт, акраслова)*
*“Анкета”*
*“Цягнік”*

*“Чароўны мяшочак”*
*“Рэфлексіўная картка”*
*“Табліца фіксацыі”*
*“Кошык ідэй”*
*“А што, калі ...?”*
*“Пісьмовае інтэрв’ю”*
*“Чамадан, мясарубка, кошык”*
*“Кластар”*
*“Тры М”*
*“Эсэ”*

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што рэфлексія – гэта важны і неабходны этап урока. Бо нездарма кажуць, што чалавек можа стаць разумным трыма шляхамі: шляхам пераймання – гэта самы лёгкі, шляхам асабістага вопыту – гэта самы цяжкі, шляхам разважання – гэта самы высакародны.

**3. Практычны блок**

А зараз мы пераходзім да практычнай часткі заняткаў, дзе на прыкладзе канкрэтнага мастацкага твора зможам папрацаваць з некаторымі прыёмамі рэфлексіі. А каб зразумець аб’ект, нам дапаможа прыём “Індуктар”. Бо мы ўсе ведаем, што літаратура – гэта адзін з відаў мастацтва. І каб зацікавіць творам, трэба моцнае эмацыянальнае ўздзеянне. Гэта можа быць музыка, карціны, кіно. А ў нас будзе мультфільм. (Беларусьфільм “Дзед”)

- Вы здагадаліся, пра які твор будзе ісці гаворка? Так, гэта казка Уладзіміра Караткевіча “Нямоглы бацька”. Адкажыце, калі ласка, што з’яўляецца асноўнай думкай гэтага твора?

Для таго, каб хутка ўзнавіць галоўную праблематыку твора, нам дапаможа ***прыём “ПАПС”* - формула** (хвіліна гаварэння).

- П – пазіцыя (Мы лічым, што…)
- А – абгрунтаванне (... таму, што…)
- П – прыклад (Вось прыклад: …)
- С – меркаванне (Значыць…)

*Жылі сілай, а розум забывалі. Жылі карысцю. Знішчалі “ўчора”і таму не мелі права на “заўтра”.*

*Шануйце дабрыню, хай сабе слабую. Шануйце мудрасць, хай сабе нямоглую. Насіце на руках бацькоў.*

- Давайце падумаем, якія прыёмы рэфлексіі былі б вельмі ўдалыя пры вывучэнні гэтага твора?

***Прыём “Шкала дабрыні”***



**Фізкультхвілінка**

***Метад “Друдлы”***

Друдлы – гэта цікавае вынаходніцтва амерыканскага юмарыста і прадзюсара, якое яны прапанавалі ў 1950-х гадах. Назва паходзіць, як камбінацыя трох слоў: каракулі, малюнак, загадка.

Так, друдлы – гэта загадкі. Друдл адзін, а версій мноства. Мэта: развіццё творчага мыслення.

Кожнай групе даецца свой друдл, усе ўдзельнікі па чарзе запісваюць свае асацыяцыі. Потам агучваюць другой камандзе. Другая каманда можа выказаць свае прапановы наконт убачанага, якія яшчэ не прагучалі.

***Прыём “Творчая лабараторыя”***

Мы перанясёмся ў Японію і паспрабуем напісаць верш хайку. Такі верш напісаць некалькі цяжэй, таму што ў ім выказваецца асабістае перажыванне чалавека. Разам з тым гэтая вершаваная форма таксама мае пэўныя плюсы. У хайку самым гарманічным чынам спалучаецца праца з паняццем і эмацыйнае стаўленне да яго.

Вось адзін з алгарытмаў напісання хайку:

Радок 1: Я бачыў каго-небудзь ці што-небудзь.

Радок 2: Якога? Якую?

Радок 3: Як?

*Прыклады хайку:*

Снягір
Я бачыў птушку,
Якая прыляцела зімой.
Прыгожа ...

Туга
Я бачыла вёску
З адным домам.
Тужліва ...

***Прыём “Што, калі...”.*** Ён мяркуе ўключэнне на этапе рэфлексіі пытанняў, якія пачынаюцца са слоў: Што, калі ...? Дадзеныя пытанні дазваляюць вучням па-новаму, з другога боку паглядзець на праблему, вылучыць свае здагадкі, свае гіпотэзы развіцця падзей, спрыяючы развіццю гіпатэтычнага мыслення вучняў. (Што, калі б ...)

*Што, калі... Пятро не вярнуўся б за бацькам, пакінуў бы старога ў лесе?*

*Што, калі ... Пятро не паспеў, і агеньчык у лесу згас?*

*Што, калі... Пятро не хаваў бы бацьку, а адкрыта заявіў, што забраў старога з лесу?*

***Прыём “Красэнс”*** (Распрацавалі рускія філолагі ў 2002 годзе.) Яго прымяненне на ўроках спрыяе развіццю лагічнага, вобразнага і асацыятыўнага мыслення, уяўлення; праявы нестандартнага мыслення і крэатыўнасці; развіццю камунікатыўных уменняў; фарміраванню навыкаў працы з інфармацыяй; павышэнню дапытлівасці і матывацыі.




***Прыём “Адным словам”*** ( Як вы адчувалі сябе на нашых занятках?)

А зараз звернемся да нашых табліц-фіксацый і запоўнім іх поўнасцю. Агучце, калі ласка, вашы прапановы.

***Прыём “Дзякуй”***

А зараз я прапаную вам літары, а вы на кожную з іх прыдумайце фразу, якая б перадала вашы ўласныя пачуцці і думкі ад нашай працы.

Скончыць нашу сустрэчу я хацела словамі Бернарда Шоу: “Калі ў Вас ёсць яблык і ў мяне ёсць яблык, і калі мы абмяняемся гэтымі яблыкамі, то ў Вас і ў мяне застанецца па адным яблыку. А калі ў Вас ёсць ідэя і ў мяне ёсць ідэя, і мы абмяняемся гэтымі ідэямі, то ў кожнага будзе па дзве ідэі ... ”



# Урок-квэст
# як форма навучання і выхавання пры выкладанні вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура"
# "Лірычная гасцёўня"

**Мэты:** стварэнне новага адуцыйнага асяроддзя праз арганізацыю гульнёвай формы "квэста" на ўроках па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура".

**Задачы:** вывучыць канцэптуальныя ідэі, асноўныя прынцыпы арганізацыі квэстаў для правядзення занятка;
стварыць умовы для фарміравання матывацыйнай гатоўнасці ўдзельнікаў урока да азнаямлення з формай "квэста";
праз форму "квэст" узнавіць веды пра віды лірыкі.

**Падрыхтоўчая работа:** падрыхтаваць маршрутныя лісты, падабраць лірычныя творы, распрацаваць і раздрукаваць заданні, стварыць прэзентацыю.

**Абсталяванне:** таблічкі з назвамі станцый, маршрутныя лісты, кам'ютар, тэлевізар, відэаролік "Смак мовы", карткі з заданнямі, творы.

## Ход урока-квэста

**1. Арганізацыйны момант**

Добры дзень! Я рада вас вітаць на сённяшніх занятках! Наш слоган на сёння: Не ведаеш, што рабіць? Усміхніся! (Чаму? Што абазначаюць гэтыя словы?)

У кожнай цяжкай сітуацыі – усміхніся... Пад час складанага выбару – усміхніся... Новаму дню – усміхніся... Добраму чалавеку – усміхніся! А нядобраму – два разы...

***Прыём "Ланцужок дабрыні"*** (Па чарзе сказаць адно добрае слова суседу).

Я спадзяюся, што нашы заняткі будуць праходзіць у атмасферы цеплыні, дабрыні і ўсмешак!

Наша сустрэча пройдзе ў форме ўрока-квэста. Чаму гэта актуальна і цікава? *(Абмеркавенне праблемнага пытання).*

- актыўная, дынамічная, цікавая і разумова напружаная форма адпачынку;
- інтэлектуальная трэніроўка, дзякуючы якой павышаецца здольнасць мысліць, заўважаць дробныя дэталі, аналізаваць сітуацыю;
- набор праблемных заданняў, якія патрабуюць уключэння ў пошукавую дзейнасць.

Такім чынам, мы высветлілі задачы, якія рэалізуе “квэст”. Як у кожнай гульні, у нас павінен быць дэвіз, які аб’яднае нас усіх, зацікаўленых падарожнікаў.

**Дэвіз квэст-урокаў**

**К**алі ты хочаш мову добра ведаць,
**В**азьмі за правіла: цікаўнасць – перамога.
**Э**мблема пошуку: тым, хто ідзе, дарога
**С**ама падкажа, што і дзе разведаць.
**Т**ы зможаш, правілы – твая падмога!

А якія мы можам прыгадаць віды работы для арганізацыі квэст – урокаў?
*К* – крыжаванка, крыптаграма, канспект кросэнс, кластар…
*В* – верш, віктарына, вывады, выступленне, выбар …
*Э* – эксперымент, экзамен, экспертыза, экспромт, эсэ …
*С* – схема, скарагаворка, сітуацыя, справаздача, сінквейн…
*Т* – табліца, тэст, трэнінг, тлумачэнне, тэатр…

**2. Тэарытычнае абгрунтаванне праблемы.**

Што ж такое “квэст”? Квэст (англ. Quest), або прыгодніцкая гульня (англ. Adventure game), – адзін з асноўных жанраў камп’ютарных гульняў, які ўяўляе сабой інтэрактыўную гісторыю з галоўным героем. Найважнейшымі элементамі гульні ў жанры квэста з’яўляюцца ўласнае апавяданне і даследаванне свету, а ключавую ролю ў гульнёвым працэсе адыгрываюць рашэнне галаваломак і задач, якія патрабуюць ад гульца кемлівасці.

І якія можам даць рэкамендацыі для правядзення ўрока-квэста?
- заданні на кемлівасць, логіку, эрудыцыю, знаходлівасць;
- цікавы кантэкст;
- разнапланавыя заданні;
- выканалі заданне – рухайцеся далей;
- дзейнічаем самастойна;
- самакантроль выхоўвае самастойнасць і адказнасць.

Такім чынам, мы атрымалі ўяўленне пра ўрок-квэст. Мне засталося вас запрасіць у “Лірычную гасцёўню”. Чаму ў лірычную, запытаецеся вы? А таму, што сёння мы будзе падарожнічаць па цудоўнай краіне Паэзіі, зможам дакрануцца да багатай скарбніцы беларускай лірыкі. І яшчэ раз зразумеем, наколькі прыгожае і спеўнае наша беларускае слова.

**3. Практычны блок**

У нас 4 каманды, гэта значыць, што вам трэба прайсці чатыры прыпынкі. Для гэтага неабходна вызначыцца з маршрутам. У кожнай каманды ён будзе свой. Маршрутныя лісты перад вамі.

## МАРШРУТНЫ ЛІСТ 1 (прыклад)



**КАХАННЕ! МЫ Ў ТВАІМ ПАЛОНЕ...**



**ПРАЦЯГЛАЕ РЭХА ВАЙНЫ...**




**ЗАЎСЁДЫ З НАМІ КОЛАС І КУПАЛА!**



**СІВОЙ МІНУЎШЧЫНЫ ТУТ ПОСТАЦІ СТАЯЦЬ...**

1 прыпынак – Каханне! Мы ў тваім палоне...
2 прыпынак – Працяглае рэха вайны...
3 прыпынак – Заўсёды з намі Колас і Купала!
4 прыпынак – Сівой мінуўшчыны тут постаці стаяць...

**1 прыпынак “Каханне! Мы ў тваім палоне... ”**

*Заданне да верша А. Куляшова “Бывай”*

- Запоўніце цытатны кластар: знайдзіце і выпішыце з твора светлыя і сумныя пачуцці, якімі прасякнуты верш.

| | СВЕТЛЫЯ | СУМНЫЯ | |
|---|---|---|---|
| ______ | | | ______ |
| ______ | | | ______ |
| ______ | | | ______ |
| ______ | | | ______ |
| ______ | | | ______ |
| ______ | | | ______ |

*Творчасць.* Складзіце чатырохрадкоўе на тэму кахання.
*Апорныя словы:* каханне, замілаванне, вера, жаданне, надзея, спатканне, роздум, маўчаннне, прызнанне, жыццё, забыццё, пачуццё...

**2 прыпынак "Працяглае рэха вайны... "**

*Заданне да верша А. Вярцінскага "Рэквіем па кожным чацвёртым"*

- Прыдумаць назву да кожнай часткі

Уступ________________________________________________

Частка першая__________________________________________

Частка другая__________________________________________

Частка трэцяя__________________________________________

Эпілог______________________________________________

- Якія рэальныя асобы ўзгадваюцца ў творы? Імёны якіх яшчэ салдат-герояў вам вядомы?

**3 прыпынак "Заўсёды з намі Колас і Купала! "**

*Заданне да верша П.Броўкі "Купала і Колас, вы нас гадавалі! "*

- Чаму, на вашу думку, аўтар у апошніх радках верша гаворыць: Дык дзякуй Вам, Колас, дык дзякуй, Купала.
- Узгадайце, дзе і якім чынам на Беларусі ўшанавана памяць Янкі Купалы і Якуба Коласа.

**4 прыпынак "Сівой мінуўшчыны тут постаці стаяць... "**

*Заданне да верша Кастуся Цвіркі "Францыск, Скарынін сын"*

- Чаму ў вершы паэт называе Скарыну пілігрымам_______________________________________________
  ______________________________________________________
- доктарам_____________________________________________
  ______________________________________________________
- Суаднясіце паняцці і іх тлумачэнне

| | |
|---|---|
| 1) гуманіст | а) эпоха росквіту мастацтваў, станаўлення навук, узнікнення кнігадрукавання, пераходны перыяд ад Сярэднявечча да Новага часу. |
| 2) асветнік | б) да сваіх кніг ён піша прадмовы і пасляслоўі, перапрацоўвае рэлігійныя тэксты, перакладае іх на беларускую мову, каб былі кнігі зразумелымі шырокаму чытачу. |
| 3) Адраджэнне | в) Скарына – заснавальнік беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. |
| 4) пісьменнік і перакладчык | г) у цэнтры яго ўвагі знаходзіўся чалавек; ён сам з'яўляецца прыкладам патрыятычнага служэння свайму народу, ідэям дабра. |
| 5) першадрукар | д) выданнем кніг Скарына вырашаў пастаўленыя перад сабой задачы – паслужыць простым людзям, дапамагчы ім пазнаць мудрасць і навуку, праз чытанне кніг пашырыць кругагляд. |

Адказы : 1 _______ 2 ________ 3 _______ 4 _________ 5___________

**4. Справаздача кожнай каманды**

- Вось наша квэст-гульня падышла да канца. Вы не стаміліся? Ёсць яшчэ моц трымаць адказ за тое, што дасягнулі ў час вандроўкі?

- Лідар каманды расказвае, што атрымалася, у чым былі цяжкасці, што запомнілася падчас сумеснай працы.

Абмеркаванне:

- у якіх класах лепш праводзіць урокі-квэсты?
- што пройдзе лепш: мова ці літаратура?
- колькасць груп?

**5. Рэфлексія, падвядзенне вынікаў**

***Прыём "Акраслова"***

К – кемлівасць
В – весялосць
Э – эрудыцыя
С – суполка
Т – творчасць

І напрыканцы нашай сустрэчы хачу прапанаваць паглядзець вам невялічкі відэафільм "Смак родай мовы".

Якая асалода жыць,
Знаць вартасць кожнае гадзіны.
Тым, што адкрыта, даражыць.
І адкрываць за дзівам дзіва.
Васіль Вітка



**Майстар-клас**
**“Сучасны метадычны інструментарый настаўніка ў рабоце з адоранымі вучнямі ”**

**Мэта:** арганізацыя педагагічнага ўзаемадзеяння для апрацоўкі метадычнага інтрументарыя ў рабоце з адоранымі вучнямі.
**Задачы:** стварыць умовы для фарміравання матывацыйнай гатоўнасці ўдзельнікаў майстар –класа да азнаямлення з матэрыялам;
даць уяўленне сучасным формам работы з адоранымі вучнямі;
прадэманстраваць магчымасці выкарыстаных формаў работы з адоранымі вучнямі і прагназуемыя вынікі іх прымянення.

**Ход майстар-класа**

**1. Арганізацыйны момант**

Добры дзень! Я рада вас вітаць на сённяшніх занятках! Тэма нашых заняткаў “Сучасны метадычны інструментарый настаўніка ў рабоце з адоранымі вучнямі”.

***Прыём* “*Камплімент*”**

Шаноўныя калегі, я хачу, каб наша сустрэча прайшла ў атмасферы дабрыні, цеплыні і павагі. І пагэтаму я прапаную пачаць нашу сустрэчу з кампліментa.

***Прыём* “*Індуктар*”** – праблемная сітуацыя – пачатак, матывуе творчую дзейнасць кожнага. (Мэта: дапамагчы суаднесці старыя веды з новымі).

У кожнай групы ёсць частка вокладкі часопіса. Задача кожнай групы за 1 хвіліну на лісце запісаць як мага больш характарыстык (прыметнікаў) часткі вокладкі часопіса. *(Групы агучваюць свае характарыстыкі)*.

А цяпер я хачу задаць пытанне, як гэта практыкаванне асацыіруецца з вашай педагагічнай дзейнасцю. Магчыма ёсць варыянты, здагадкі. (*Педагогі прапануюць свае варыянты)*.

Так, кожны элемент вокладкі з’яўляецца часткай цэлага. У вучэбным працэсе кожны настаўнік бачыць толькі фрагмент індывідуальных здольнасцей вучня. Дзіця, якое да нас прыходзіць, – гэта цэлая і непадзельная сістэма са сваімі асаблівасцямі, характарыстыкамі, пра якія мы павінны ведаць і заўсёды памятаць.

- Паважаныя калегі, а што такое **“адоранасць”?** Што мы ведаем пра гэта паняцце?

**2. Тэарытычнае абгрунтаванне праблемы**

На пачатку заняткаў нам неабходна зразумець тэарытычнае абгрунтаванне паняцця "адоранасць" і як выявіць яе ў сучасных вучнях.

Адоранасць – гэта наяўнасць патэнцыяльна высокіх здольнасцяў у чалавека. Пад паняццем "адоранасць" часам выкарыстоўваюцца словы "талент, здольнасць, геніяльнасць, харызма, дар, працаздольнасць".

А як нам, настаўнікам, разгледзець, асэнсаваць, што перад намі сапраўды адораны вучань? Для гэтага педагогамі-псіхолагамі распрацаваны дыягнастычны інструментарый. І ў залежнасці ад узросту вучняў ён прымяняецца на індывідуальных занятках педагогамі-псіхолагамі.

**Дыягностыка творчай дзейнасці**:

- тэсты крэатыўнасці;
- тэсты-гульні;
- праектныя методыкі.
-

**Праца з вынікамі дыягностыкі:**

-удзел у творчых конкурсах, алімпіядах, канферэнцыях…

Аналіз вынікаў; выяўленне адоранасці вузкага накірунку (мастацтва, спевы, літаратурная творчасць, спорт і г.д.); узровень самаацэнкі; матывацыя; задавальненне патрэб.

І падвядзем вынік, якія віды адоранасці бываюць?

- мастацкая (музычна- мастацкая)
- псіхаматорная (спартыўная)
- акадэмічная (здольнасць вучыцца)
- інтэлектуальная (уменне аналізаваць, супастаўляць, рабіць вывады і прагнозы)
- творчая (нестандартнае мысленне)

Таксама ў кожнага вучня адоранасць бывае яўнай (праяўленай), узроставай, схаванай (непраяўленай).

І вось, нарэшце, педагогі-псіхолагі дапамаглі выявіць такога вучня, ён прыйшоў да нас. Што нам з ім рабіць?

**3. Практычны блок**

Любое навучанне павінна адбывацца праз дыялог:

- вучні смела выказваюць сваё разуменне прапанаванага матэрыялу;
- настаўнік падтрымлівае жаданне вучня аргументаваць свае ідэі;
- вучань і настаўнік дзеляцца сваімі знаходкамі і адкрыццямі:

Скажыце мне, і я забуду,
пакажыце мне, і я запомню,
зацікаўце мяне, і я зразумею!

Зацікавіўшыся тэмай, я вылучыла для сябе вельмі слушную работу настаўніцы беларускай мовы і літаратруры ДУА "Гімназія № 1 імя Францыска Скарыны г. Мінска" Сцяшко Любові Уладзіміраўны "Сістэма

работы з высокаматываванымі вучнямі пры падрыхтоўцы да алімпіяд па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “ Беларуская літаратура”.

Аналіз практыкі падрыхтоўкі вучняў да алімпіяд па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” выяўляе шэраг **праблем і супярэчнасцей,** якія носяць аб’ектыўны характар. Напрыклад:

- паміж колькасцю гадзін вучэбнага плана на вывучэнне прадметаў “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” і тым часам, які патрэбны для дасягнення добрых вынікаў пры падрыхтоўцы да алімпіяд;
- паміж матывацыяй вучняў да авалодвання беларускай мовай і пераважным рускамоўным асяроддзем, якое не вельмі гэтаму спрыяе;
- паміж зацікаўленасцю дзяцей у паглыбленым вывучэнні роднай мовы і жыццёвымі поглядамі бацькоў, якія выбіраць іншыя накірункі пазнавальнай дзейнасці для свайго дзіцяці.

З чаго ж пачынаць падрыхтоўку вучня да ўдзелу ў алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры? Мы павінны дзяцей зацікавіць сваім прадметам. А ў гэтым нам дапамогуць гульнёвыя формы работы, калі дзеці, працуючы ў творчых групах, парна ці індывідульна, набываюць ці пашыраюць свае веды. Выдатны педагог Станіслаў Тэафілавіч Шацкі пісаў, што “гульня” – гэта жыццёвая лабараторыя дзяцінства.

| Этап выяўлення высокаматываваных вучняў | Этап падрыхтоўкі да алімпіяд (індывідуальная работа, групавая работа) |
|---|---|
| 5-6 клас | - конкурс “Буслік”;<br>- конкурс чытальнікаў;<br>- інтэрнэт-алімпіяды. |
| 7-8 клас | - сістэматызацыя ведаў пра тэкст, тэму;<br>- рашэнне лінгвістычных задач па марфалогіі;<br><u>Першыя крокі да напісання водгуку:</u><br>- патрабаванні да ўступу;<br>- уменне падабраць цытату;<br>- патрабаванні да галоўнай часткі;<br>- паглыбіць паняцце пра выяўленчыя сродкі выразнасці. |
| 9-11 клас | - сістэматызацыя ведаў па ўсіх раздзелах мовазнаўства;<br>- выкананне алімпіядных заданняў розных гадоў;<br>- работа над цяжкімі пытаннямі сінтаксісу і пунктуацыі;<br>- выкананне творчых заданняў па літаратуры;<br>- напісанне водгукаў на творы беларускіх паэтаў. |

Я з’яўляюся ўдзельнікам творчай групы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры Мінскай вобласці. У складзе групы МАІРА выдаў метадычнае выданне “Рыхтуемся да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры: комплексная работа”. Я распрацоўвала заданні да 6 класа.

**Варыянты творчых заданняў**

А якія заданні можна прапанаваць вучням, каб абудзіць цікавасць да прадмета, развіваць іх мысленне і творцыя здольнасці?

Запоўніце табліцу, размеркаваўшы словы *батэрфляй, бейсбол, гравюра, гросмайстар, джаз, джунглі, дызель, камюніке, картэж, ландшафт, медальён, паштамт* па адпаведных групах запазычанай лексікі.

| Запазычанні з англійскай мовы | Запазычанні з нямецкай мовы | Запазычанні з французскай мовы |
|---|---|---|
| батэрфляй<br>бейсбол<br>джаз<br>джунглі | гросмайстар<br>дызель<br>ландшафт<br>паштамт | гравюра<br>камюніке<br>картэж<br>медальён |

**П*рыём “Скончы фразу”***

| **Тэма ўрока** | **Скончы фразу** |
|---|---|
| Якуб Колас<br>“Дзядзька-кухар” (7 клас) | 1. Дарослыя адрозніваюцца ад дзяцей тым, што яны ...<br>2. Узаемаадносіны дарослых і дзяцей павінны быць ...<br>3...... |
| Віктар Карамазаў<br>“Дзяльба кабанчыка” (8 клас) | 1. Добра, калі ёсць сваякі ў вёсцы, бо ...<br>2. Прыязджаючы ў вёску да бабулі, я перш-наперш …<br>3. ..... |
| Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч<br>“Пінская шляхта” (9 клас) | 1. У маім уяўленні шляхта – гэта …<br>2. Мне вядомы знакамітыя шляхецкія роды ...<br>3. ....... |

*Групам прапануецца сфармуляваць сваю фразу.*

Тэма: Вобразная сістэма камедыі Кандрата Крапівы “Хто смяецца апошнім” Заданне: Сфармуляваць жыццёвае крэда герояў п’есы.

*Варыянты адказаў.*

Крэда Гарлахвацкага: на чужых спінах у вялікія вучоны ўехаць.

Крэда Зёлкіна: падслухаць, навесці плёткі, дагадзіць начальніку – і я ў шакаладзе.

Крэда Чарнавуса: траціць час на абарону ўласнага “я”, не для мяне. Хто ж тады будзе кнігі пісаць.

Крэда Веры: бараніць сумленных людзей. Гатова ўзяць віну на сябе, калі спатрэбіцца.

Крэда Тулягі: самае складанае – перамагчы самога сябе.

Групам прапануецца паспрабаваць сфармуляваць жыццёвыя крэда галоўных герояў камедыі Кандрата Крапівы “Хто смяецца апошнім”.

1 група
Жыццёвае крэда Зёлкіна
2 група
Жыццёвае  крэда Чарнавуса
3 група
Жыццёвае крэда Тулягі

**Суаднесці творы, іх герояў і падзеі**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **1** | Максім Гарэцкі Апавяданне “Літоўскі хутарок” | **А** | Гастрыт, Мульцік, Ганна | **Е** | Паказ імкнення чалавека да зямлі і волі, аўтабіяграфічны твор |
| **2** | Янка Купала Драма “Раскіданае гняздо” | **Б** | Міхал, Ганна, Антось, Яська, Алесь, Кастусь | **Ж** | Боль і трывога за лёс неперспектыўных вёсак і адзінокіх яе жыхароў |
| **3** | Змітрок Бядуля Апавяданне “Бондар” | **В** | Зоська, Сымон, Паніч, Данілка, Старац, Незнаёмы | **З** | Пошукі крыніцы існавання сялянства, шляхоў вызвалення Бацькаўшчыны, барацьба за захаванне людзьмі сваіх “гнёздаў” |
| **4** | Аляксей Дудараў Драма “Вечар” | **Г** | Даніла, Аўдоцця | **І** | Падзеі Першай сусветнай вайны |
| **5** | Якуб Колас Паэма “Новая зямля” | **Д** | Ян, Даміцэля, Ядвіся, Монця, Сініца | **К** | Створаны вобраз таленавітага чалавека з народа, паказаны яго імкненні, расчараванні; праблема мастака і мастацтва |

1 __ __   2 __ __   3 __   __ 4 __ __  5 __  __

Адказ:  1 Д І,   2 В З,   3 Г К,   4 А Ж,    5 Б Е

**Знайдзіце і падкрэсліце ў сказах фразеалагізмы, замяніце іх на антанімічныя.**
а) Суп прыгатавалі – пальчыкі абліжаш.
б) Суседзі жылі як кот з сабакам, уся вёска ведала пра гэта.
в) Хлопец вырас кату па пяту, але ніхто ніколі не смяяўся з яго.
г) Усю ноч я спаў на адно вока, а раніцай падняўся і пайшоў да ракі.
д) “Ці не кінуць якар у гэтым горадзе?” – падумаў былы марак.

***Для даведкі:*** як пшаніцу прадаўшы, зняцца з якара, душа ў душу, хоць на сабаку вылі, з каломенскую вярсту.

**4. Рэфлексія**

***Прыём “3X2X1”***

- тры галоўныя моманты, якія я асэнсаваў;
- дзве рэчы, якія я магу прымяніць;
- адно пытанне, якое мяне турбуе…
-

***Прыём “Адным словам”***

У пачатку сустрэчы мы гаварылі адзін аднаму кампліменты. На прыканцы заняткаў пры дапамозе аднаго слова выкажыце свой настрой ці адчуванне. Словы могуць быць розныя.

А скончыць сустрэчу я хачу словамі Льва Мікалаевіча Талстова: “Як ні дзіўна гэта сказаць, а мастацтва патрабуе значна большай дакладнасці... чым навука”.

Жадаю вам: “Цікавіцца, даследаваць, ствараць – перамагаць!”

Дзякуй за ўвагу!



## Урок беларускай літаратуры ў 6 класе
## “Літаратурная песня. Алесь Ставер “Жураўлі на Палессе ляцяць…”

**Мэты:** даць пачатковае ўяўленне пра літаратурную песню.
**Задачы**: выклікаць у вучняў эмацыянальны водгук на адну з песенных візітак Беларусі, створаную на верш А.Ставера; прааналізаваць аўтарскія перажыванні; разумець функцыянальную ролю тропаў у мастацкім тэксце; абудзіць у дзяцей патрыятычныя пачуцці.
**Абсталяванне:** падручнікі, тэлевізар, аўдыязапіс песні “Жураўлі на Палессе ляцяць”, карткі з заданнямі, выстава дзіцячых малюнкаў.

**Ход урока:**

1. **Арганізацыйна-матывацыйны этап**

Добры дзень, дзеці! Я рада вітаць вас на сённяшнім уроку! Паглядзіце адзін на аднага, усміхніцеся адзін аднаму, а зараз мне! Малайцы! І так мы пачынаем!

Запрашаю ўсіх у чароўную казку,
Што завецца прыроднай красой.
Няхай дзень вас атуліць
Сардэчнаю ласкай.
Хай не дрэнна вам будзе са мной.

Я хачу нагадаць вам правілы нашага супрацоўніцтва:

- галоўнае не вынік, а сам працэс;
- веды не даюцца, а будуюцца;
- праца кожнага ацэньваецца;

І няхай дэвізам нашага ўрока будзе: *супрацоўніцтва, творчасць, сумесны пошук.*

***Прыём “Эпіграф”***

Я жадаю вам добрага настрою на ўроку, а ў якасці эпіграфа да нашых заняткаў я прапаную наступныя радкі з вершаў. Давайце іх прачытаем:

О, край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей на свеце божым
Гэтых светлых берагоў...
Якуб Колас

І часта, так часта бывае,
Што мы ў сумятлівым жыцці
Мінаем і не заўважаем
Красу сваіх родных мясцін.
Мікола Хведаровіч

У канцы ўрока мы абавязкова да гэтых радкоў звернемся і адкажам на пытанне, чаму менавіта гэтыя словы ўзяты ў якасці эпіграфа.

**2. Аперацыйна-пазнавальны этап**

А накіруемся мы ў краіну Паэзіі. Паэты – таленавітыя і незвычайныя людзі. Яны ўмеюць убачыць хараство душы чалавека, стварыць вобразныя малюнкі роднага краю. У сваёй творчасці паэты часта звяртаюцца да тэмы Радзімы, сцвярджаюць непарыўную повязь з роднай зямлёй. Як вы думаеце, чаму паэтаў так хвалюе гэтая тэма?

Беларускі народ вельмі песенны. Часам кажуць, што наша зямля спявае, звініць песнямі. Беларусы любяць не толькі народныя песні, але і песні, якія напісалі прафесійныя аўтары – беларускія паэты і кампазітары.

А таму **тэма** нашых сённяшніх заняткаў: “Літаратурная песня. Алесь Ставер “Жураўлі на Палессе ляцяць…” Загадзя вы пачулі, што на ўроку будзе гаворка пра жураўлёў. І ў нас з вамі атрымалася выстава цудоўных малюнкаў, ваша бачанне тэмы ўрока. І ў вас атрымалася! Малайцы!

А зараз давайце паспрабуем паставіць перад сабой **задачы**, якія мы павінны вырашыць на уроку? (Дзеці выказваюць свае меркаванні). Давайце абагулім нашы адказы.

Перш, чым знаёміцца з творам таго ці іншага паэта, мы ўспамінаем яго жыццёвы шлях. *(Словы настаўніка пра Алеся Ставера).*

*Нарадзіўся паэт на Віцебшчыне. У вашым ўзросце разам з бацькам трапіў ў партызанскі атрад, а ў 44 годзе - у палон, вывезены ў Германію. Вясной 1945 года быў вызвалены. Вершы пачаў пісаць у 19 год. Верш “Жураўлі на Палессе ляцяць...” з’яўляецца не толькі візітнай карткай творчасці паэта, многія называюць яго песенным сімвалам Беларусі.*

Зараз мы з вамі пазнаёмімся з гэтым цудоўным вершам (*Чытанне верша ўслых настаўнікам).*

- Які настрой выклікаў у вас верш?

А зараз мы звернемся да імправізаванага слоўнічка, дзе змешчаны словы, якія могуць быць для вас незразумелымі.( Праца з тлумачальным слоўнікам).

Перад тым, як вы пачнеце працаваць у групах, праслухайце песню “Жураўлі на Палессе ляцяць” на музыку Ігара Лучанка ў выкананні ансамбля “Песняры”.

- Ці прынесла вам асалоду праслуханая песня? Узмацніла яна той настрой, які склаўся пасля праслухвання верша, ці змяніла яго?
-

**3. Этап першаснай праверкі разумення і карэкцыі ведаў**

А зараз усе свае ўражанні ад прачытанага і праслуханага вы абмяркуеце ў час працы ў групах. Заданні змешчаны ў вас на картках, вы можаце на іх працаваць.

Час працы абмежаваны – 4 хвіліны.

**1 група**. Карыстаючыся артыкулам “Літаратурная песня” раскажыце, хто на Беларусі выконваў народныя песні. Як сёння называюць тых, хто выконвае народныя і літаратурныя песні?
**2 група.** Якія малюнкі-вобразы стварыў Алесь Ставер у вершы? З якім пачуццём аўтар гаворыць пра родную зямлю? Знайдзіце ў творы радкі, якія адлюстроўваюць галоўную думку твора.
**3 група.** Якія сродкі мастацкай вобразнасці дапамаглі аўтару стварыць дакладныя малюнкі? Прывядзіце прыклады з тэксту.

**Фізкультхвілінка “Падарожжа па суседзях беларусаў”**

- Вы, напэўна, крыху стаміліся? Адкладзіце ручкі, устаньце. Мы падарожнічаем ў краіну Паэзіі, і таму зробім невялікае падарожжа да нашых суседзяў:

- на поўначы ад Беларусі жывуць літоўцы і латышы (рукі падняць уверх);
- на поўдні ад Беларусі жывуць украінцы (нагнуцца і дакрануцца да падлогі);
- на захадзе ад Беларусі жывуць палякі (адной рукой пацягнуцца ўбок);
- на ўсходзе ад Беларусі жывуць расіяне (другой рукой пацягнуцца ўбок);
- а гэта наша краіна – Беларусь (рукамі зрабіць круг).

**Адказы удзельнікаў груп**

Наша Беларусь – край блакітны’азёр, сасновых бароў, мурожных лугоў, зялёных гаёў, добрых і гасцінных людзей! Гэта наша Радзіма!

Я вам прапаную прыказкі і прымаўкі пра нашу родную старонку, а вы мне павінны дапоўніць іх. За правільныя адказы да вас прыляцяць жураўлі. Яны будуць улічвацца пры пастаноўцы адзнакі.

Няма смачнейшае вадзіцы, як з роднай …. крыніцы.
Радзіма – матка, чужына –…… мачыха.
Родная зямелька як зморанаму – …..пасцелька.
У сваім краі, як ….. у раі.
На чужыне і камар ….. загіне.
Кожнаму свой куток ….. мілы.
Усюды добра, а дома…… лепей.
Кожная сасна свайму бору песню …. пяе.
На чужой старане не сагрэе і …. сонца.
Бацькоў не цурайся, а ад Радзімы не ….. адракайся.
З роднага боку і варона ….. мілая.
Чалавек без Радзімы, што птушка без …. крылаў.

А зараз я прапаную крыжаванку, дзе мы ўспомнім многае, пра што ішла гаворка на ўроку. Слухайце ўважліва!

1. Зжатае хлебнае поле, іржышча.
2. Краіна, якую паэт называе “мілай”.
3. Цёплы край, куды адлятаюць на зімоўку птушкі.

4. Мастацкі прыём, перанясенне ўласцівасцей адной з'явы на другую, чым- небудзь падобную на яе.
5. Мастацкі прыём, характарыстыка аднаго прадмета, з'явы пры дапамозе яго супастаўлення з іншымі.
6. Балоцістая нізінная мясцовасць, прыродны рэгіён на поўдні Беларусі.
7. Мастацкае азначэнне, якое вобразна характаразуе прадмет, з'яву, чалавека.

А зараз мы зноў звернемся да нашыхэпіграфаў. Як вы лічыце. це змянілася ваша меркаванне?

**4. Падвядзенне вынікаў урока, рэфлексія**

***Прыём "Дрэва"***

Дзеці, мы сёння шмат з вамі гаварылі пра прылёт жураваў на родныя гнёзды, на радзіму. А калі гэта адбываецца? Сёння у мяне ёсць дрэва, яно непрыгожае, голае, трэба даць яму новае жыццё. А зрабіць мы гэта зможам пры дапамозе лістоты, якая ляжыць перад вамі. Вы бачыце зялёныя, жоўтыя і чырвоныя лісты.

Зялёны лісток – працаваў паспяхова, задаволены сабой.

Жоўты лісток (гатовы ўпасці) – часткова засвоіў тэму.

Чырвоны лісток (амаль у дарозе) – ёсць вялікія складанасці.

Выбірайце свой лісток і прымацуйце яго да дрэва. Якое яно стала прыгожае!

**5. Дамашняе заданне, інструктаж**

Вывучыць на памяць верш Алеся Ставер "Жураўлі на Палессе ляцяць".

На ўроке ўсе добра і плённа працавалі, я вамі вельмі задаволена. (Ацэньванне працы груп і асобных вучняў. выстаўленне адзнак).

А напрыканцы я хачу пажадаць вам поспехаў і новых адкрыццяў!

Вялікі дзякуй за ўрок! Да пабачэння!



## Урок беларускай мовы ў 9 клас
## “Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах”

**Мэты:** паглыбленне ведаў пра складаназлучаны сказ, сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах.

**Задачы:** выпрацоўваць уменні вызначаць сэнсавыя адносіны паміж часткамі у складаназлучаных сказах; будаваць схемы складаназлучаных сказах; утвараць складаназлучаныя сказы, выкарыстоўваючы спалучальныя злучнікі; выхоўваць павагу да гістарычнага мінулага свайго народа.

**Ход урока:**

**1. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

Добры дзень, дзеці! Я рада вітаць вас на сённяшнім уроку! Паглядзіце адзін на аднага, усміхніцеся адзін аднаму, а зараз мне! Малайцы! І так мы пачынаем!

**2. Этап актуалізацыі ведаў**

Пачаць наш урок я хачу ўрыўкам з верша П. Панчанкі “Святочныя салюты”. Слухаем ўважліва, бо да яго будуць пытанні.

Грымяць, грымяць святочныя салюты...
І феерверкі зырка рассыпаюцца,
І дзетвара да батарэй збягаецца,
І смех, і крык на кожнай плошчы людная.
Руіны пад асфальтам ціха стогнуць,
І прывіды мінулага ўстаюць,
І б’юць гарматы ў маладосць маю,
І вусны ад пякельнай смагі сохнуць…

- Якім настроем прасякнуты верш?
- Што за дату будзе святкаваць наша краіна? ( 75 год з дня вызвалення нашай краіны ад нямецкай навалы).
- Пры дапамозе якіх сказаў змог аўтар перадаць увесь трагізм вайны?

Сёння на ўроку мы не проста будзем весці гутарку пра складаназлучаны сказ, а паспрабуем разабрацца пры дапамозе чаго ствараецца сэнсавае адзінства складаназлучаных сказаў. Інакш кажучы, пры дапамозе чаго звязваюцца часткі ў такіх сказах.

А зараз давайце пастаўім перад сабой **задачы**, якія мы павінны вырашыць на уроку? (Малайцы!) Давайце абагулім нашы адказы.

**3. Аперацыйна-пазнавальны этап**

Праца з падручнікам

- Зараз вы будзеце працаваць з падручнікам, пры дапамозе параграфа 7(с.40) вам трэба запоўніць табліцу “Сродкі сувязі частак у складаным сказе”. (На выкананне 3 хвіліны).

**Сродкі сувязі частак у складаназлучаным сказе**




Самаправерка .

**4. Этап першаснай праверкі разумення і карэкцыі ведаў**

Мы з вамі даведаліся, што злучнікі з’яўляюцца асноўным граматычным паказчыкам складаназлучаных сказаў.  Якія злучнікі? Таксама мы павінны зразумець, што гэтыя злучнікі паказваюць на тыя сэнсавыя адносіны, якія ўзнікаюць паміж часткамі сказа. Агучце гэтыя адносіны.

*Спалучальныя адносіны :* адначасовасць, пералічэнне, прычына ці вынік падзей.

*Супраціўныя адносіны:* супастаўленне ці супрацьпастаўленне.

*Размеркавальныя адносіны:* чаргаванне, магчымасць аднаго факта ці з’явы з ліку названых.

Малайцы, а зараз нам трэба навучыцца нашы набытыя веды прымяняць на практыцы. Перад вамі сказы, вы павінны размеркаваць іх паводле злучнікаў.

1. Ідуць гады, і кожны дзень чакае маці сына.
2. Дзень хіліўся на вечар, а доўгія цені дрэў ужо дыхалі вячэрнім халадком.
3. Сасонкі яшчэ не высокія, але ўжо ўвабраліся ў сілу.
4. Жыццё закон нязломны мае, ды праўда ніколі не ўмірае.
5. Ці то стогне бура, ці віхор гуляе.
6. Вецер не сціх, затое з ранейшай сілай хістаў сосны.
7. То свеціць сонца, то пахмурна.
8. Чужому навучайся, ды свайго не цурайся.
9. Ні колас на ніве не скалыхнецца, ні ліст на дрэве не зварухнецца.
10. Ці то песню заспяваць, ці то конікам скакаць.

(Ключ на слайдзе).

**Фізкультхвілінка**

- Вы, напэўна, крыху стаміліся?

Адкладзіце ручкі, сядзьце зручней, заплюшчыце вочы і ўявіце:
Ярка свеціць сонца, дуе лёгкі ветрык.
Я ўдыхаю чыстае паветра.

Калыхаюцца травы на лугах.
Над маёй галавою кружаць птушкі.
Мне хораша і прыемна.
Я хачу жыць у згодзе з прыродай, з людзьмі...
Я хачу жыць у згодзе з сабою...

- Расплюшчыце вочы, працягваем працу.

***Прыём “Канструктары”***

А зараз мы з вамі будзем працаваць канструктарамі. Вы паспрабуеце самі сканструяваць складаназлучаныя сказы пры дапамозе апорных слоў. Працаваць будзем па варыянтах.

*1 варыянт*

Ужо няма сіл…. яны ўпарта ідуць наперад.
Месяц знік у аблоках …над ракой падняўся туман.

*2 варыянт*

Вочы ў яе былі добрыя… ён спяваў песню пра гэтыя вочы.
Яны не раз клікалі рыбака да сябе …той толькі адмаўляўся.

А 3 чалавекі будуць працаваць ля дошкі , яны запішуць складаназлучаныя сказы, вызначаць граматычную аснову і паспрабуюць скласці схемы.

**Выніковы тэст**

**1 варыянт**

1. Адзначце складаназлучаныя сказы.
а) Трэба працу любіць, каб у пашане быць.
б) Неба сеяла цяпло, і цёплы дождж цярушыць.
в) У думках радасна было, ды беглі песні ад душы.
г) Якуб Колас падзякаваў за увагу, падышоў да кніжнай шафы, дастаў “Новую зямлю”.

2. Адзначце складаназлучаныя сказы са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі.
а) То перашкаджала надвор’е, то работа не ладзілася.
б) Злева і справа бялелі новыя школы, і роўнымі радамі прабягалі маладыя сады.
в) Ужо сонца праглядала праз вершаліны хвой, і пачынала адчувацца гарачыня лета.
г) У яго так балела галава, але чаканы сон не прыходзіў.

3. Адзначце складаназлучаныя сказы з супраціўнымі сэнсавымі адносінамі.
а) Толькі пачынала брацца на дзень, але сонца было недзе далёка за лесам.
б) Яму проста не верыцца яшчэ, аднак гэта адбывалася з ім.
в) Заходзіла сонца, і пачыналі бялець у цемнаце новымі стрэхамі вёска.
г) То хмызнякі ўздымаюцца, то векавыя волаты ў бары ў край не пускаюць таямніцы.

4. Адзначце складаназлучаныя сказы з размеркавальнымі сэнсавымі адносінамі.
а) У сяле яшчэ доўга чуліся песні ды чуўся брэх сабак.
б) Варта толькі пайсці снегу, і работы не будзе.
в) То праплыве гук баязлівы над лугам, то зноў ціха-ціха ўсё стане.
г) Ці то хмара насунецца, ці то выгляне сонца.

5. Да якога сказа адносіцца схема: [ ], і [ ].
а) На кожным чоўне льецца песня, або гучыць гармонік на беразе.
б) То ва ўсіх баках пагрымліваў гром, то мільгацела маланка.
в) Сашы было не да гэтага хараства, аднак і яна звярнула ўвагу на такі цуд прыроды.
г) За акном кружыцца ціхі снег, і блукаюць нямыя вятры.

**2 варыянт**

1. Адзначце складаназлучаныя сказы.
а) Пара б вучыцца, дык школы няма, панскія школы не вучаць дарма.
б) Гатоў ісці на мукі, каб нашым дзецям, унукам не бомбы ў спадчыну аддаць.
в) Нямала навальніц бачыла ліпа, і не раз перуны білі яе ў вехавіну.
г) Мікіта моцна пастукаў у дзверы, але з кабінета ніхто не адазваўся.

2. Адзначце складаназлучаныя сказы са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі.
а) Зямля яшчэ песціла ў сонным змроку вячэрнія ночы, а неба ледзь-ледзь пачынала святлець на ўсходзе зорамі.
б) Толькі адышлі ад немцаў, і кулі перасталі свістаць над галавой.
в) То шумяць каласамі шырокія нівы, то рассцілаюцца бясконцыя зялёныя лугі.
г) Адцвіталі ліпы, і гулі пчолы ў густым вецці прысад.

3. Адзначце складаназлучаныя сказы з супраціўнымі сэнсавымі адносінамі.
а) На кутках туман асеў густы, і возера дзяды зрабілі казкаю.
б) Сляды гарачыні яшчэ на тварах зносім, ды паплылі ўжо дні ў залатую восень.
в) Удзень павеяла халадком, а ноччу ўжо моцна падмаражвала.
г) Была нялёгкая работа, але была яна ў ахвоту.

4. Адзначце складаназлучаныя сказы з размеркавальнымі сэнсавымі адносінамі.
а) Здаецца, толькі адправілі ліст, і ўжо прыйшоў адказ.
б) Ці то бура стогне, ці то віхор гуляе.
в) Хай шчасце куецца на свеце і вечная дружба расце.
г) То было сумна на вуліцы, то цемру і цішыню зноў прарывалі гукі песні.

5. Да якога сказа адносіцца схема: [ ], а [ ].

а) Сярэдзіна красавіка, і такі мароз.
б) Вада ў лодцы прыбывала, але ніякая сіла не магла спыніць іх.
в) Мароз не сціх, а вецер з ранейшай сілай хістаў сосны.
г) Шумяць бары, і шэпчуць травы.

**5. Дамашняе заданне, інструктаж**
С. 40-42, пр. 33

**6. Падвядзенне вынікаў урока, рэфлексія**

***Прыём "Скончы сказ"***

Сёння на ўроку мне было…
На ўроку мне працавалася…
Я адчуваў сябе...

Я завяршаю наш ўрок з добрым настроем, бо сёння наша праца сапраўды была дружная і стваральная. І разам з паэтам Анатолем Грачанікавым хачу пажадаць вам, мае шаноўныя вучні:

Хай будзе светлы ваш узлёт,
Да новых спраў, сябры!
Няхай прыносіць вам жыццё
Найлепшыя дары.



# Урок беларускай літаратуры ў 5 класе
# Максім Танк "Ля вогнішч начлежных"
# (урывак з паэмы "Нарач")

**Мэта:** узнаўленне ведаў вучняў пра жанр легенды; асэнсаванне зместу паэтычнай апрацоўкі Максімам Танкам народнай легенды пра ўзнікненне возера Нарач.

**Задачы:** стварыць умовы для засваення вучнямі зместу паэтычнай апрацоўкі Максімам Танкам народнай легенды пра ўзнікненне возера Нарач; выпрацоўваць уменні характарызаваць герояў легенды, пашырыць слоўнікавы запас вучняў, развіваць камунікатыўныя навыкі і рэфлексійныя здольнасці, творчасць; выхоўваць маральнасць.

**Тып урока:** засваенне новай тэмы.

**Абсталяванне**: мультымедыйная прэзентацыя, падручнікі, сшыткі.

**Эпіграфы**: Возера Нарач, прасторнае, чыстае!
Ты, як паветра, такое празрыстае.
Ціхай пагодаю свеціцца дно, –
Ты на планеце такое адно.

Васіль Жуковіч

"Тут нешта і надзвычайнае ёсць, і не разгаданае нікім…"

Ёсць такая зямля, дзе крыніцы звіняць,
Пераліўчата ззяюць азёры,
Дзе стаяць веліканы – капцы-курганы,
Векавечным паpослыя борам.

Максім Танк

## Ход урока

### 1. Арганізацыйна-матывацыйны этап

Добры дзень, паважаныя дзеці! Я рада вас вітаць на сённяшнім уроку. Паглядзіце адзін на аднаго, усміхніцеся адзін аднаму, а зараз мне! І так мы пачынаем!

Запрашаю ўсіх у чароўную казку,
Што завецца прыроднай красой,
Няхай дзень вас атуліць сардэчнаю ласкай,
Хай нядрэнна вам будзе са мной!

### 2. Этап актуалізацыі ведаў

Вы дома пазнаёміліся з цудоўнай легендай Максіма Танка "Ля вогнішч начлежных". Вы ўпершыню пачулі легенду пра стварэнне гэтага незвычайнага возера? Калі вы сустракаліся з гэтым вобразам? (Народная легенда "Нарач")

Давайце падумаем, чым адрозніваецца народная легенда ад літаратурнай?

Што ж будзе тэмай сённяшняга ўрока? Пра што мы будзем весці гутарку?

***Прыём “Воблака слоў”***




Тэма ўрока: Максім Танк “Ля вогнішч начлежных” (урывак з паэмы “Нарач”)

**3. Мэтавызначэнне.**

Чым, на вашу думку, мы сёння будем займацца на ўроку? Давайце абагулім нашы адказы.

***Прыём “Эпіграф”***

Я прапаную вам эпіграфы да ўрока. Паслухайце іх і падумайце, які больш падыходзіць да нашай тэмы. (Агучванне эпіграфаў)

- *Разважанні дзяцей.*

Да эпіграфаў мы з вамі вернемся на прыканцы ўрока і параўнаем нашы ўражанні.

**4. Аперацыйна-пазнавальны этап**

***Прыём “Індуктар”***

А зараз я хачу вам нагадаць змест народнай легенды пра возера Нарач (*прагляд відэа*)

- Што вы ведае пра возера Нарач? (Адказы вучняў)

Сапраўды, возера Нарач незвычайнае: яно здзіўляе велічынёй сваіх водных прастораў. Нават у яснае надвор’е супрацьлеглы бераг губляецца ў туманнай дымцы. Даўжыня возера – 13 кіламетраў, шырыня – 10 кіламетраў. Глыбіня возера невялікая, але на паўднёвым усходзе дасягае 25 метраў. Калі глядзець на возера зверху, з самалёта, то кідаецца ў вочы яго акруглая форма. Можна з упэўненасцю сказаць, што возера Нарач займае ў Беларусі першае месца па чысціні і празрыстасці вады. Дно, усланае пяском і каменьчыкамі, добра бачна да глыбіні 10 метраў. Але не толькі ў нашай краіне, а і далёка за яе межамі ведаюць пра возера Нарач, якое з павагай называюць беларускім

морам. З ім звязана шмат легендаў беларускага народа, яно ўслаўляецца ў паэзіі і прозе.

Не мог абысці сваёй увагай гэтае возера і народны паэт Беларусі Максім Танк. Бо менавіта ў гэтым цудоўным і маляўнічым кутку Беларусі, на Мядзельшчыне, непадалёку ад Нарачы прайшло яго дзяцінства. Пясняр захапляўся прыгажосцю возера і любіў слухаць цікавыя гісторыі пра яго, якія расказвалі рыбакі, уладкаваўшыся ноччу ля вогнішча на адпачынак. Мусіць, таму твор і атрымаў такую назву. Каб пераканацца ў гэтым, давайце падумаем, а што абазначаюць словы з нашай назвы.

Вогнішча – распаленая куча дроў, ламачча, агонь.

Начлег – начны адпачынак, калі пасвілі коней ноччу.

Начлежнік – чалавек, які часова начуе дзе-небудзь, той, хто пасе коней ноччу.

Значыць, “ля вогнішч начлежных” – гэта ля вогнішч начлежнікаў, людзей, якія часова начуюць дзе-небудзь, ці людзей, што пасуць коней ноччу.

А зараз мы звернемся з вамі да галоўных героя твора. Хто яны? (Галіна, Васілёк, магнат Барына). А хто з’яўляецца галоўным героем твора? Чаму?

Зараз мы з вамі папрацуем у імпавізаваных групах. Колькі іх будзе?

**1 група**
**Вобраз Галіны**
- Знайдзіце ў тэксце і зачытайце ўрыўкі, у якіх аўтар апісвае Галіну, яе знешнасць, паводзіны;
- выберыце тыя рысы характару, якія найлепш характырызуюць Галіну:
добрая, злая, спагадлівая, жорсткая, сквапная, нерашучая, верная, бессардэчная, вольналюбівая, смелая, чулая.

**2 група**
**Вобраз Васілька**
- Знайдзіце ў тэксце і зачытайце ўрыўкі, у якіх аўтар апісвае Васілька, яго знешнасць, паводзіны;
- выберыце тыя рысы характару, якія найлепш характырызуюць Васілька:
таленавіты, жорсткі, сквапны, шчодры, злы, адданы, верны, адважны, нясмелы, баязлівы, смелы, высакародны, добры, рашучы, непераможны, вясёлы.

**3 група**
**Вобраз Барыны**
- Знайдзіце ў тэксце і зачытайце ўрыўкі, у якіх аўтар апісвае магната Барыну, яго знешнасць, паводзіны;
- выберыце тыя рысы характару, якія найлепш характырызуюць Барыну:
добры, ганарлівы, жорсткі, сквапны, спагадлівы, шчодры, злы, чулы, высакародны, уладарны, адданы, баязлівы, магутны, ласкавы.

**Фізкультхвілінка:“Падарожжа па суседзях беларусаў”**
- Вы, напэўна, крыху стаміліся?Адкладзіце ручкі, устаньце. Мы з вамі жывём на Беларусі,  а зараз завітаем да нашых суседзяў:
на поўначы ад Беларусі жывуць літоўцы і латышы (рукі падняць уверх);
на поўдні ад Беларусі жывуць украінцы (нагнуцца і дакрануцца да падлогі);
на захадзе ад Беларусі жывуць палякі (адной рукой пацягнуцца ўбок);
на ўсходзе ад Беларусі жывуць расіяне (другой рукой пацягнуцца ўбок);
а гэта наша краіна - Беларусь (рукамі зрабіць круг).

**Абарона груп**
- Як, паводле паэмы, узнікла возера Нарач? Адкуль з’явілася над ім белая чайка? (Настаўнік зачытвае ўрывак з паэмы ).

*Адказы вучняў*. Паводле паэмы возера Нарач з’явілася з разбітага чароўнага люстэрка Галіны. А сама яна ператварылася ў белую чайку, якая з жалобным крыкам шукае свайго каханага.
- Паўторны зварот да эпіграфаў. Ці змяніліся вашы погляды ў канцы ўрока? Які эпіграф падыходзіць найбольш удала да нашай тэмы? (Абмеркаванне вучняў)

**5. Рэфлексія.**

***Прыём “Алітэрацыя”*** (слова “Нарач”) Запішыце да кожнай літары слова сваю асацыяцыю з вобразамі нашага твора.




- Падвядзенне вынікаў урока, аналіз работы вучняў і выстаўленне адзнак.

**6. Дамашняе заданне, інструктаж.**
- скласці план твора.
А напрыканцы я хачу пажадаць вам поспехаў і новых адкрыццяў!
Вялікі дзякуй за ўрок!
Да пабачэння!

**Урок беларускай літаратуры ў 8 класе**
**Якуб Коласа "Хмарка"**

**Мэта:** асэнсаванне вучнямі ідэйнага зместуалегарычнай казкі "Хмаркі".
**Задачы:** данесці да іх нацыянальны каларыт невялікіх пазнавальна-мастацкіх твораў, думку аб нераздзельнасці чалавек з усім, што існуе на свеце; убачыць мастацкую своеасаблівасць літаратурнай казкі ў параўнанні з народнай; выхоўваць у вучняў пачуццё любові да свайго краю.
**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік, зборнік Якуба Коласа "Казкі жыцця", мультымедыйная прэзентацыя, карткі-заданні.

Эпіграф

Не шукай ты шчасця, долі
На чужым далёкім полі.
Янка Купала

**Ход урока**

**1. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

Добры дзень, сябры! Мне вельмі прыемна зноў пабачыцца з вамі. Яшчэ старажытныя грэкі казалі: "Добры настрой – гэта палова перамогі". І таму паглядзіце адзін на аднаго, усміхніцеся адзін аднаму, а зараз мне. І так мы пачынаем! А сёння ў нас не проста ўрок літаратуры, а ўрок жыцця. А чаму так вы ў хуткім часе зразумееце.

Запрашаю вас у чароўную казку,
Што завецца прыроднай красой.
Няхай дзень вас атуліць сардэчнаю ласкай,
Хай нядрэнна вам будзе са мной.

**2. Мэтавызначэнне.**

Сёння мы дакранёмся да непаўторнага таленту нашага беларускага песняра Якуба Коласа, пазнаёмімся з творам «Хмарка», які вы загадзя прачыталі дома. Апавяданне «Хмарка» уваходзіць у зборнік «Казкі жыцця».

...Казкі жыцця. Цікава? Чаму казкі? Чаму казкі жыцця? На гэтыя і іншыя пытанні мы будзем шукаць адказы на працягу 2-х урокаў.

Увогуле у цыкл "Казкі жыцця" ўваходзяць 32 невялікія творы, якія аўтар ствараў на працягу амаль паўстагоддзя (1908-1955 гады).

- Звярніце ўвагу на эпіграф да ўрока. Што абазначаюць гэтыя словы? Ці актуальныя яны ў наш час?
- Якія праблемныя пытанні мы будзем вырашаць на ўроку?

**Прыём "Карусель"**
- *абагульненне адказаў вучняў.*
Запіс у сшыткі даты і тэмы ўрока.

**Прыём "Асацыяцыя"**

Якія асацыяцыі ў вас узнікаюць, калі чуеце словы "шчасце, доля"? Запішыце вашы ўласныя адчуванні.

**3. Аперацыйна-пазнавальны этап**

Працу над праблемным пытаннем пачынаем з работы ў групах. (Вучні атрымліваюць заданні на картках.)

Вырашаць праблемныя пытанні мы будзем пры дапамозе **прыёма "Колы Вена"** (Адказы вы павінны размясціць у колы па прынцыпу: чым бліжэй да цэнтру, тым больш ясна і зразумела, а чым далей – цяжка.)



**1 група**
Што такое алегорыя? Ці можна твор Якуба Коласа "Хмарка" назваць алегарычным апавяданнем? Чаму?
**2 група**
Падзяліце твор на часткі. Як адчувала сябе Хмарка ў падарожжы, з кім яна сустрэлася і якую праўду аб жыцці пачула?
**3 група**
Што змянілася ў поглядах Хмаркі на жыццё пасля доўгага і далёкага падарожжа? Якая галоўная думка твора і як яна суадносіцца з эпіграфам?
**4 група**
Як вы лічыце, ці ёсць нешта агульнае паміж творамі Рыгора Барадуліна "Трэба дома бываць часцей", Аляксея Дударава "Вечар" і Якуба Коласа "Хмарка"?

**Фізкультхвілінка (хвілінка рэлаксацыі)**

*Мы жывем у бязмежым свеце. Мы, як тыя хмаркі, імкнемся да далёкіх берагоў, недасяжных даляў. Шукаем прытулку, заспакаення і гармоніі, шукаем сябе. Але ў гэтым віры жыцця, у гэтым бясконцым палёте не заўважаем прыгожосць вакол нас. Азірніцеся, свет вакол нас непаўторны, прыгожы і родны. Ён ваш, ён наш...*

**Абарона груп**

**Прыём "Пчаліны вулей"** (Кожная група адказвае на сваё пытанне і ў сваю чаргу прыдумвае пытанне да наступай групы, і так па чарзе).

**4. Этап першаснай праверкі разумення і карэкцыі ведаў**

А зараз мы звернемся з вамі да вуснай народнай творчасці, да прыказак. толькі прыказкі нашы будзе аб'яднодноўваць адна тэма. Вы яе агучыце, калі правільна з складзеце.

**Прыём "Жакей і конь"**

Знайсці часткі і скласці правільна прыказку, растлумачыўшы яе змест.

1. Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.
2. Для ўсякай птушкі сваё гняздо міла.
3. Хоць еш крапіву да салому, але пры дому.
4. Чым за морам віно піць, лепей з Нёмана вадзіцу.
5. З роднага боку і варона мілая.
6. Свая хатка – родная матка, а чужая – мачыха.
7. Родная зямелька – як зморанаму пасцелька.
8. Чужая хата горш за ката
9. Дзе маці нарадзіла, там і радзіма.
10. Дома і салома ядома, а на чужыне і гарачы тук стыне.
11. Ля сонца цёпла, ля дома добра.
12. Далёкая старонка без ветру сушыць.
13. На чужыне і камар загіне.
14. Чалавек без Радзімы, як салавей без песні.
15. Няма лепш за той куток, дзе вязалі пупок.
16. У чужой старонцы не так свеціць сонца.

- Дзеці, ці ёсць агульнае паміж народнымі казкамі і аўтарскімі, літаратурнымі? (Адказы вучняў)

**5. Рэфлексія**

**Прыём "Кросэнс".** Складанне галаваломкі на тэму "Не шукай ты шчасця, долі на чужым далёкім полі.." (Дзецям раздаюцца паштоўкі з выявамі. Яны выбіраюць патрэбныя часткі і размяшчаюць іх у пэўным парадку, каб атрымаўся лагічны ланцужок.)

- выстаўленне адзнак вучням кожнай групы.

**6. Дамашняе заданне, інструктаж.**

- скласці выказванне на тэму "Мая Айчына – поле, нівы.."

## Майстар – клас “Выкарыстанне тэхналогіі візуалізацыі ў адукацыйным працэсе”

**Мэта:** арганізацыя педагагічнага ўзаемадзеяння для апрацоўкі метадычнага інтрументарыя пры выкарыстанні тэхналогіі візуалізацыі.

**Задачы:** стварыць умовы для фарміравання матывацыйнай гатоўнасці ўдзельнікаў майстар –класа да азнаямлення з матэрыялам; даць уяўленне сучасным формам выкарыстання тэхналогіі візуалізацыі; прадэманстраваць магчымасці выкарыстаных формаў работы і прагназуемыя вынікі іх прымянення.

**Эпіграф:** Новае пакаленне – гэта новы час. І не трэба цягнуць дзяцей у свой час. Трэба самому вучыцца жыць тым часам, у якім сталеюць твае вучні.

А. Анастасіеў

### Ход майстар-класа

**1. Арганізацыйны момант**

Добры дзень! Я рада вас вітаць на сённяшніх занятках! Тэма нашай сустрэчы “Выкарыстанне тэхналогіі візуалізацыі ў адукацыйным працэсе”.

***Прыём "Камплімент"***

Шаноўныя калегі, я хачу, каб наша сустрэча прайшла ў атмасферы дабрыні, цеплыні і павагі. І пагэтаму я прапаную пачаць нашу сустрэчу з кампліментаў адзін аднаму.

***Прыём "Эпіграф"***

Паслухайце, калі ласка, словы і выкажыце свае адносіны да пачутага.

Новае пакаленне – гэта новы час. І не трэба цягнуць дзяцей у свой час. Трэба самому вучыцца жыць тым часам, у якім сталеюць твае вучні.

А. Анастасіеў

***Прыём «Індукцыя»*** - *праблемная сітуацыя - пачатак, матывуе творчую дзейнасць кожнага. (Мэта: дапамагчы суаднесці старыя веды з новымі.)*

Я прапаную вам прагледзець відэа. А цяпер я хачу задаць пытанне, якое дачыненне гэта відэарад мае да нашай тэмы. (Педагогі прапануюць свае варыянты. *Відэа*: https://cameralabs.org/11291-kak-fotografii-zakhvatili-smi-60-000-stranits-the-new-york-times-za-odnu-minutu)

***Прыём "До" і "Пасля"***

У вас на сталах ляжаць паперы са словам "До". Вам трэба запісаць свае прапановы наконт нашай тэмы. Усё, што вам знаёма. Да часткі "Пасля" мы вернемся ў канцы заняткаў.

- Паважаныя калегі, што такое "**візуалізацыя**"**?** Што мы ведаем пра гэта паняцце?

**2. Тэарытычнае абгрунтаванне праблемы**

На пачатку заняткаў нам неабходна зразумець тэарытычнае абгрунтаванне паняцця "візуалізацыя" і прымяненне тэхналогіі на ўроках .

Што такое візуалізацыя? Само па сабе паняцце з'яўляецца дастаткова шматгранным, існуе некалькі азначэнняў ў залежнасці ад таго, аб якім полі дзейнасці ідзе гаворка. Мэтай візуалізацыі з'яўляецца перадача дадзеных. Гэта азначае, што дадзеныя павінны зыходзіць ад чагосьці абстрактнага або, па меншай меры, не быць відавочнымі адразу. Візуалізацыя аб'ектаў- гэтаператварэнне з нябачнага ў бачнае. Псіхолагі лічаць, што 80% сучасных школьнікаў візуалы і толькі 20% аўдыялы і кінестэтыкі. Даследчыкі ў галіне адукацыйных методык выявілі, што праз тры дні пасля правядзення лекцыі слухачы ў стане ўспомніць 10 % ад усяго пачутага, 35 % ад усяго ўбачанага, але могуць узнавіць 65 % зместу прэзентацыі, калі яна праходзіла ў выглядзе вуснага аповеду, падмацаванага візуальнымі выявамі. Чалавек, зрок якога забяспечвае яму каля 90% інфармацыі, заўсёды імкнецца да нагляднасці. Такім чынам, пры арганізацыі вучэбнага працэсу існуе неабходнасць візуалізацыі інфармацыі.

Візуалізацыя - гэта прадстаўленне любой інфармацыі ў графічным выглядзе, часам ва ўяўленні. Слова «візуалізацыя» было ўтворана ад лацінскага visualis, што перакладаецца як «глядзець». Гэта метад прадстаўлення інфармацыі, фізічных і сацыяльных працэсаў і з'яў, падзей у выглядзе аптычнага малюнка (напрыклад, у выглядзе малюнкаў і фатаграфій, графікаў, дыяграм, структурных схем, табліц, карт і г.д.)

Яшчэ адно значэнне слова «візуалізацыя» - гэта ўласцівасць чалавечай свядомасці фармаваць вобразы. Чалавек успрымае свет, як чараду візуальных вобразаў, а гэта лепшы сродак запомніць ці вывучыць новы матэрыял, і таму гэта актыўна выкарыстоўваецца ў адукацыйных методыках.

***Перавагі візуалізацыі ў навучанні:***

дапамагае навучэнцам правільна арганізоўваць і аналізаваць інфармацыю. Дыяграмы, схемы, малюнкі, карты памяці спрыяюць засваенню вялікіх аб'ёмаў інфармацыі, дапамагаюць лёгка запамінаць і прасочваць узаемасувязі паміж блокамі інфармацыі;

развівае крытычнае мысленне;

дапамагае навучэнцам інтэграваць новыя веды;

дазваляе злучаць атрыманую інфармацыю ў цэласную карціну.

**Тэхналогія візуалізацыі навучальнай інфармацыі** - гэта сістэма, якая ўключае ў сябе наступныя складнікі:

комплекс навучальных ведаў;

візуальныя спосабы іх прадстаўлення;

візуальна-тэхнічныя сродкі перадачы інфармацыі;

набор псіхалагічных прыёмаў выкарыстання і развіццё візуальнага мыслення падчас навучання.

**Функцыі візуалізацыі вельмі разнастайныя.** Яна можа ўжывацца з мэтай:

дапамагчы апрадмечванню славеснага паведамлення ці прадставіць паведамленне, якое вучань павінен будзе ўвасобіць у форму аповеду ці адказу на пастаўленыя пытанні;

пракантраляваць цэласнасць і характар засваення перададзенай настаўнікам інфармацыі;

спрыяць развіццю ўяўлення і фантазіі;

выявіць характар індывідуальнага ўспрымання і перапрацоўкі навучальнай інфармацыі;

актывізаваць пазнавальную цікавасць;

сканцэнтраваць увагу на чымсьці важным;

пераключыць увагу на іншы аб'ект;

выклікаць вызначаныя асацыяцыі;

развіваць здольнасці да аналізу і параўнання;

арганізаваць трэніроўку ўважлівасці і назіральнасці;

сфарміраваць здольнасці рабіць высновы і лагічныя вывады;

сфарміраваць здольнасці бачыць і праводзіць аналогіі, усведамляць і абгрунтоўваць свой пункт гледжання, аргументаваць сваю пазіцыю, замацоўваць вывучаны матэрыял;

развіваць крытычнае мысленне;

інтэграваць новыя веды;

звязаць атрыманую інфармацыю ў цэласную карціну пра тую ці іншую з'яву ці аб'ект.

**Візуалізацыю можна выкарыстоўваць на ўсіх этапах навучання:**

пры тлумачэнні новага матэрыялу;

пры паўторы матэрыялу;

пры замацаванні і абагульненні вывучанага;

пры кантролі і сістэматызацыі ведаў;

пры выкананні дамашніх заданняў;

завучванні на памяць;

пры працы з тэкстам твора;

пры самастойнай працы і г.д.

**Метадычныя прыёмы тэхналогіі візуалізацыі:**

**Таймлайны** (ад англ " timeline " – "лінія часу") – гэта часовая шкала, прамы адрэзак, на які ў храналагічнай паслядоўнасці наносяцца падзеі. Лініі або стужкі часу выкарыстоўваюцца пры працы з біяграфіямі або творчасцю пісьменніка, а таксама для фарміравання ў вучняў сістэмнага погляду на гістарычныя працэсы. Іншая сфера выкарыстання таймлайну – кіраванне праектамі. Таймлайн ў праектнай дзейнасці дапамагае ўдзельнікам адзначаць і бачыць этапы рэалізацыі праекта, тэрміны яго заканчэння.

**Інтэлект-карта** (ментальная карта, карта памяці, дыяграма сувязяў, карта думак, асацыятыўная карта, карта розуму) – гэта графічны спосаб прадставіць ідэі, канцэпцыі, інфармацыю ў выглядзе карты, якая складаецца з

ключавых і другасных тэм. Гэта інструмент для структуравання ідэй, планавання свайго часу, запамінання вялікіх аб'ёмаў інфармацыі, правядзення мазгавых штурмаў.

**Скрайбінг** (ад англійскага " scribe " – накідваць эскізы або малюнкі) – гэта візуалізацыя інфармацыі пры дапамозе графічных знакаў, якія проста і зразумела адлюстроўваюць яе змест і ўнутраныя сувязі. Тэхніка скрайбінга была вынайдзена брытанскім мастаком Эндру Паркам. Выступ у тэхніцы скрайбінга – гэта перш за ўсё мастацтва суправаджэння прамовы "на ляту" малюнкамі фламастарам на белай дошцы (або лісце паперы). Як правіла, ілюструюцца ключавыя моманты аповеду і ўзаемасувязі паміж імі. Стварэнне яркіх вобразаў выклікае ў слухача візуальныя асацыяцыі з прамовай, што забяспечвае высокі працэнт засваення інфармацыі.

**Коміксы** (ад англ. comic – «смешны» – гэта намаляваныя гісторыі, апавяданні ў малюнках.Коміксы павышаюць матывацыю да вучэння, яны здольныя прыкаваць наш погляд і прымусіць прачытаць рэплікі герояў. Чытаць коміксы значна лягчэй і цікавей, чым доўгія тэксты. Чытанне і разуменне кароткіх коміксаў можа ўсяліць упэўненасць у сваіх здольнасцях, якая часам так неабходная ў працэсе навучання. Вясёлыя карцінкі забяспечваюць візуальную падтрымку навучанню і, самае галоўнае, дазваляюць зняць напружанне, заціск, які ўзнікае пры вывучэнні незнаёмага матэрыялу

**Інфаграфіка** – гэта графічны спосаб падачы інфармацыі, дадзеных і ведаў. Асноўнымі прынцыпамі інфаграфікі з'яўляецца змястоўнасць, сэнс, лёгкасць успрымання і алегарычнасць. Для стварэння інфаграфікі могуць выкарыстоўвацца табліцы, дыяграмы, графічныя элементы і г.д. Ёсць гатовыя сэрвісы для стварэння асабістай інфанрафікі: https://www.canva.com/ https://www.infogram.com/ https://www.piktochart.com/




**Кросэнс** – ад англ. (inter - “паміж”; act – “дзеянне”). Дзевяць малюнкаў расстаўлены ў ім такім чынам, што кожны малюнак мае сувязь з папярэднім і наступным, а цэнтральны аб'ядноўвае па сэнсу адразу некалькі. Сувязі могуць быць як павярхоўнымі, так і глыбіннымі. Задача навучэнцаў – растлумачыць кросэнс, скласці аповед –асацыятыўны ланцужок, пасродкам

узаемасувязі малюнкаў. Чытаць кросэнс трэба зверху ўніз і злева направа, далей рухацца толькі наперад і заканчваць на цэнтральным 5 квадраце, такім чынам, атрымліваецца ланцужок, закручаны «слімаком». Пачаць можна як першага, так і з любога вядомага малюнка. Цэнтральным з'яўляецца квадрат з нумарам 5. Па жаданні аўтара, ён можа быць злучаны па сэнсе з усімі малюнкамі. Звычайна ж трэба ўсталяваць сувязі па перыметры паміж квадратамі 1-2, 2-3, 3-4, 5-6, 6-7, 7-8, 8-9, а таксама па цэнтральным крыжы паміж квадратамі 2-9, 6-9. Кросэнс прыдуманы ў 2002 годзе пісьменнікам, педагогам  і матэматыкам Сяргеем Федзіным.

**Кластар** — гэта графічная форма арганізацыі інфармацыі, калі вылучаюцца асноўныя сэнсавыя адзінкі, якія фіксуюцца ў выглядзе схемы з пазначэннем усіх сувязяў паміж імі. Ён уяўляе сабою малюнак, які спрыяе сістэматызацыі і абагульненню навучальнага матэрыялу.




**Гексы** -  гэта шасцівугольнікі (часцей, у выглядзе сотаў), у якіх прадстаўлены веды па пэўным аспекце. Кожны з шасцівугольнікаў далучаецца да другога дзякуючы паняційным сувязям. Гексы могуць быць намаляваны ў сшытку або зроблены з паперы. Пры дапамозе гексаў можна скласці стужку часу або зрабіць іх поўнасцю ілюстраванымі.

**QR-код** – квадратная выява, з дапамогай якой можна кадаваць любую інфармацыю: тэкставую, аўдыя, відэа, мапы, адрасы і г.д. У навучальным працэсе прымяненне QR-кодаў надае вучэбнаму матэрыялу новую арганізацыйную форму, прывабную для сучасных школьнікаў ужо тым, што для раскадзіроўкі патрэбна прымяніць улюбёны гаджат. Ствараюцца QR-коды з дапамогай спецыяльных сэрвісаў (mobizon.kz; http://qrcoder.ru/). Кадаваць можна дадатковую інфармацыю па тэме ўрока, індывідуальныя заданні, спасылкі на патрэбныя рэсурсы ў Сеціве, тэставыя заданні, спасылкі на экранізацыі і тэатральныя пастаноўкі, спасылкі на электронныя тэксты і інш.

Выкарыстанне QR-кодаў паказвае станоўчы вынік і на ўроках літаратуры, і на ўроках мовы: з’яўляецца магчымасць ахапіць значна большы аб’ём вучэбнага матэрыялу, развіваюцца навыкі апрацоўкі інфармацыі.

**КОЖНЫ ДЗЕНЬ ПРЫНОСІЦЬ ШТОСЬЦІ НОВАЕ!**
**КАРЫСТАЙСЯ!**

**Лагічны ланцужок** – прыём дапамагае запомніць і асэнсаваць вялікі аб'ём інфармацыі, выявіць заканамернасць якіх-небудзь падзей, з'яў. Прыём працуе на развіццё крытычнага мыслення, развіццё памяці і ўменне лагічна думаць. Стратэгія прыёму складаецца ў пабудове ланцужка з фактаў, прапаноў, слоў, дат, цытат, размешчаных у лагічным ці храналагічным парадку.

**Апорны канспект** – гэта скарочаны сімвалічны запіс матэрыялу, які вывучаецца, гэта пабудаваная па адмысловых прынцыпах візуальная мадэль утрымання навучальнага матэрыялу, у якой сціснута намаляваны асноўныя сэнсавыя вехі тэмы, што вывучаецца.

**Фішбоўн** – (шкілет рыбы) Схема складаецца з асноўных чатырох блокаў, прадстаўленых у выглядзе галавы, хваста, верхніх і ніжніх костачак. Злучальным звяном выступае асноўная костка ці хрыбет рыбы. Галава – праблема, пытанне, тэма, якая падлягаюць аналізу, параўнанню, абмеркаванню. Верхнія косткі (размешчаныя справа пры вертыкальнай форме схемы ці пад кутом 45 градусаў зверху пры гарызантальнай) – на іх фіксуюцца асноўныя паняцці тэмы, складнікі, якія прывялі да праблемы. Ніжнія косткі (малююцца насупраць) – факты, якія пацвярджаюць наяўнасць сфармуляваных складнікаў, ці сутнасць паняццяў, паказаных на схеме. Хвост– адказ на пастаўленае пытанне, высновы, абагульненні.

**Воблака слоў** (воблака тэгаў, word cloud, tag cloud) – гэта спіс слоў, якія часцей за ўсё сустракаюцца ў тэксце. Спіс афармляецца наглядна, у якой-небудзь форме (напрыклад, воблака, дрэва, прамавугольніка і г.д.). У такім воблаку можна зашыфраваць словы любімага верша ці песні, таксама воблакам можна аформіць спіс слоў-асацыяцый.

У навучальным працэсе воблака слоў можна выкарыстоўваць на розных этапах урока.

Праверка дамашняга задання: выпішыце словы з вывучанай арфаграмай; адзначце вывучаныя тэрміны, дайце ім тлумачэнне і пад.

Паведамленне тэмы, мэтавызначэнне і матывацыя: выпішыце словы з воблака і сфармулюйце тэму; збяры прыказку і скажы, як яна стасуецца з тваім настроем сёння; выпішыце імёны герояў пэўнага твору; якія пытанні вы хацелі б ім задаць?

Вывучэнне новага матэрыялу: складзіце сказ са слоў воблака, падкрэсліце галоўныя члены; складзіце воблака слоў, у якім пазначце геаграфічныя назвы, якія адносяцца да біяграфіі пісьменніка і пад.

Замацаванне матэрыялу: вызначце тэрміны, з якімі мы пазнаёміліся на ўроку, дайце ім азначэнне; знайдзі лішняе слова; выберыце тыя словы, якія характарызуюць пэўнага героя і пад.

Рэфлексія: стварыце воблака са слоў, якія адлюстроўваюць ваш стан напрыканцы ўрока; выпішыце з воблака дзеясловы, якія характарызуюць вашу работу на ўроку.

Сэрвісаў для стварэння влблака слоў даволі многа: https://wordcloud.pro/ru/signin. Tagul, WordItOut, http://облакослов.рф/oblako/

**Практычнае заданне:** Вам прапануецца воблака слоў. З прапанаваных слоў знайдзіце патрэбныя словы з двух вядомых апавяданняў. Назавіце аўтараў і назвы твораў.




**ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА**

Зрабіце некалькі глыбокіх уздыхаў і паслабцеся. Старайцеся візуалізаваць прадмет або сітуацыю так выразна і ва ўсіх падрабязнасцях, як гэта магчыма. Заплюшчыце вочы і паспрабуйце ўявіць, што вы на летнім лузе.

*Давайце дацягнемся да блакітнага неба…*
*Станем галінкамі моцнага дрэва.*
*І прабяжым па гасцінцы знаѐмым.*
*Разам паслухаем шэлест лістоты.*
*Позіркам родны абшар абвядзѐм.*
*А потым уважліва ўдаль паглядзім*
*І роднай зямлі паклон аддадзім.*

**Колы Вена» («Дыяграма Вена») –** прыём, які стаў актыўна прымяняцца ў рамках тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення. Упершыню прыём апісаны англійскім вучоным Джонам Венам у кнізе "Сімвалічная логіка". Гэта графічны спосаб, які выкарыстоўваецца, калі трэба параўнаць ад двух ці больш паняццяў, з'яў, спосабаў, прадметаў. "Колы Вена" дапамагаюць выявіць агульнае, падкрэсліць адрозненні і абагульніць веданне па тэме. Анлайн-сэрвіс https://www.canva.com/design

**Буктрэйлер –** гэта кароткі відэаролік, які распавядае ў адвольнай мастацкай форме аб якой-небудзь кнізе. Буктрэйлеры прапагандуюць чытанне і рэкламуюць асобныя кнігі з дапамогай візуальных сродкаў, характэрных для трэйлераў да кінафільмаў. Як правіла, працягласць буктрейлера складае не больш за 3 хвіліны. Такія ролікі здымаюць як да

сучасных кніг, так і да кніг, якія сталі літаратурнай класікай. (*Прагляд бруктрэйлера да паэмы Я.Купалы "Магіла льва")*.



**Друдлы** – гэта цікавае вынаходніцтва амерыканскага юмарыста Роджара Прайса і прадзюсара Леанарда Стэрна, якое яны прапанавалі ў 1950-х гадах. Назва паходзіць ад камбінацыі трох слоў: каракулі, малюнак, загадка. Так, друдлы - гэта загадкі. Друдл адзін, а версій мноства. Мэта: развіццё творчага мыслення.

**Практычнае заданне:** Кожнай групе даецца свой малюнак з друдламі, усе ўдзельнікі думаюць, ці нагадваюць вам дадзеныя малюнкі эпізоды з твораў. Потым агучваюць другой камандзе. Другая каманда можа выказаць свае прапановы наконт убачанага, якія яшчэ не прагучалі. У пустыя клетачкі можна намаляваць уласны друдл.

**Пантбук –** цудоўны сродак праверкі засвоенай інфармацыі па тэме. Мэта выкарыстання – зацікавіць вучняў, скласці нетрадыцыйны пашпарт твору, героя, пісьменніка, часціны мовы і інш. Вучні атрымліваюць гатовыя шаблоны, на знешнім баку якіх прапісаны крытэрыі характарыстыкі (для біяграфіі пісьменніка, напрыклад, гэта будзе прозвішча, імя; гады жыцця, месца нараджэння, адукацыя, праца, назвы найбольш значных твораў, захапленні і г. д).

На ўнутраным баку вучні пішуць адказы, працуючы з падручнікам або прыгадваючы матэрыял урока. Можна працаваць індывідуальна, парна або групах на розных этапах урока. У старэйшых класах вучні могуць самі задаваць крытэрыі характарыстыкі адзін аднаму пры рабоце ў парах, праводзячы потым ўзаемаацэнку. Пры афармленні пантбука выкарыстоўваюцца малюнкі, фотаздымкі, графічныя сімвалы і пад. Дадзены сродак дазваляе зрабіць больш разнастайнай работу на ўроку, садзейнічае развіццю творчых здольнасцей вучняў, спрыяе лепшаму засваенню інфармацыі.

**Практычнае заданне:** Кожнай групе даюцца пантбукі, задача ўдзельнікаў запоўніць іх патрэбнай інфармацыяй.

**Прытча** (“мова” каштоўнасцей) – невялікі алегарычны аповед павучальнага характару. Прытча блізкая да байкі, але, у адрозненне ад апошняй, не мае традыцыйных умоўных персанажаў. Галоўная асаблівасць прытчы – іншасказальнасць, калі за пэўнымі, часам штучнымі, падзеямі, апісанымі ў творы, угадваюцца рэальныя з'явы рэчаіснасці. У прытчы, паводле Францыска Скарыны, схавана "мудрасць, як моц у дарагім камені, і

золата ў пяску, і ядро ў арэху".  Своеасаблівымі прытчамі з'яўляюцца "Казкі жыцця" Якуба Коласа.

Раскрываючы сэнс прытчы, вучні знаходзяць нешта для сябе, прымяраюць прытчу на свой невялікі жыццёвы вопыт. Затым з гэтай прытчы вучні могуць акрэсліць тэму ўрока, задачы. Гэта, на маю думку, садзейнічае выхаванню творчага мыслення, культуры маўлення, упэўненасці ў сваіх сілах. Напрыклад,  пры вывучэнні апавядання Змітрака Бядулі “Бондар” (10 клас) можна выкарыстаць прытчу пра дзве сахі.

У аднаго селяніна былі дзве аднолькавыя сахі. Але адну саху селянін браў з сабою ў поле, а другая заставалася стаяць у куточку. Саха, якая выкарыстоўвалася ў працы, была прыгожай, бліскучай. Другая ж пачынала ржавець. Аднаго разу сяброўкі сустрэліся.

— Скажы, чаму ты такая прыгожая? — спытала першая. — Я ж увесь час прастаяла ў куточку, і паглядзі, што са мной сталася.

— Гэта безработце цябе згубіла, — адказала ёй сяброўка”.

Якія заданні можна прапанаваць вучням, каб абудзіць цікавасць да прадмета, развіваць іх мысленне і творчыя здольнасці? Падзяліцеся сваімі знаходкамі. (Агучванне ўдзельнікамі ўласных прапаноў)

**3. Рэфлексія**

***Прыём "До" і "Пасля"***

Мы выказваем нашы ўражанні "Пасля" занятка.

***Прыём "Вясёлка"***

Чырвоны колер – чакаў канца

Аранжавы колер – апантана працаваў

Жоўты колер – жадаў (чакаў) дапамогі

Зялёны колер – зацікавіўся

Блакітны колер – бавіў час

Сіні колер – сур'ёзна паглыбіўся

Фіялетавы колер – фундаментальна засвоіў

А скончыць сустрэчу я хачу словамі амерыканскага вучонага і вынаходніка Томаса Эдзісана: "Я не цярпеў паражэнняў. Я проста знайшоў 10000 спосабаў, якія не працуюць".



# ФОТАСПРАВАЗДАЧА












Слова наша роднае










13.02.2018 Урок-квэст як форма
навучання і выхавання
выкладанні вучэбнага
„Беларуская














МЕТАФАРА
ПАРАЎНАННЕ
ЭПІТЭТ